Державна Наукова Бібліотека ім. Короленко. Харків

Пролетарыі ўсіх краін, аб'ядайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 5 (5981) | 6 студзеня 1938 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ. — Вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва за высокі ўраджай.

Перад сесіяй Вярхоўнага Совета СССР. Наказы выбаршчыкаў сваім дэпутатам.

Перапіс жывёлы па БССР.

Нарада маладых стаханаўцаў у ЦК ВЛКСМ.

Нарада актывістак — хатніх гаспадынь.

Арганізуем соцспаборніцтва за высокі ўраджай!

Партыйнае жыццё (хроніка).

АРТЫКУЛЫ:

С. Б. — Міжнародны агляд.

А. Р. Мац. — Як мы дабіліся рэкордных выпрацоўкі.

Я. Ізашын. — У Уздзенскім леспрамгасе не адбылося ніякіх змен.

Ал. Суркоў. — Вялікі рускі паэт-дэмакрат.

А. Марозаў. — Па некрасаўскіх месцах.

Л. Гарэлік. — Фурнітура.

Ф. Канстанцінаў. — Непаваротлівасць.

Г. Барысовіч, В. Астроўскі. — Аб трамвайным руху ў Менску.

ЗА РУБЯЖОМ:

Мадрыдская абласная канферэнцыя компартыі Іспаніі. — На франтах у Іспаніі. — Непераўзыйдзены ўзор нагласці драпежнікаў. — Ваенныя дзеянні ў Кітаі. — Рост забастовачнага руху ў Польшчы. — Антыпольскія выступленні фашысцкіх заправіл у Данцыгу.

ВЫШЭЙ СЦЯГ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ЗА ВЫСОКІ УРАДЖАЙ

Соцыялістычнае земляробства ў 1937 годзе прадэманстравала перад усім светам сваю найвялікшую сілу, арганізаванасць і невычарпальныя магчымасці. Краіна атрымала каля сямі мільярдаў пудоў хлеба. Гэта — найлепшы адказ калгаснай вёскі на заклік вялікага Сталіна даць краіне 7—8 мільярдаў пудоў хлеба. Усё больш і больш выяўляюцца перавагі буйнага соцыялістычнага земляробства.

Але поспехі сельскай гаспадаркі ў мінулым годзе не з'яўляюцца мяжою. Наадварот, яны могуць і павінны быць перакрыты ў 1938 годзе, першым годзе трэцяй сталінскай пяцігодкі. Ніколі не ўшакойваецца на дасягнутым — вось закон большэвізма. Магчымасці нашых калгасаў і соўгасаў бязмежныя. І задача партыйных і непартыйных большэвікоў накарыстаць гэтыя магчымасці да канца. «Калгасы, як соцыялістычная форма арганізацыі гаспадаркі, — гаварыў таварыш Сталін, — могуць паказаць цуды гаспадарчага будаўніцтва, калі на чале іх стануць сапраўдныя рэвалюцыянеры, большэвікі, комуністы».

Перамогі самі не прыходзяць. Іх трэба арганізоўваць, за іх трэба па-большэвіцку змагацца. Каб заваяваць высокі ўраджай у 1938 годзе, трэба ў першую чаргу ўзорна падрыхтавацца да веснавой сяўбы, неабходна арганізаваць шырокую хвалю соцыялістычнага спаборніцтва за ўраджай у кожным калгасе, соўгасе і МТС.

Дзесяткі і сотні калгасаў рэспублікі ўжо разгарнулі соцыялістычнае спаборніцтва за ўзорную падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Узважваючы ўсе свае магчымасці, калгасныя звенні і брыгады канкрэтна вызначаюць лічбы будучага ўраджаю. Яны абавязваюцца змагацца за 18—20—25 цэнтнераў збожжавых з гектара, 250—300 цэнтнераў бульбы з гектара, 5—6 цэнтнераў ільнавалакна з гектара і т. д. Свае самаабавязацельствы яны падмацоўваюць канкрэтнай большэвіцкай работай па падрыхтоўцы да сяўбы.

Вось, напрыклад, калгас «Чырвоная змена» ў Любаньскім раёне. У 1937 годзе ён атрымаў ураджай па 22 цэнтнеры аўса, 15 цэнтнераў ячменю з гектара. Калгаснікі паставілі перад сабой задачу ў гэтым годзе заваяваць яшчэ большы ўраджай. Праведзена вялікая работа па асушванню балот. Падрыхтавалі шмат мінеральнага ўгнаення. За зімовы перыяд на калгасныя палі вывозіцца 1.500 вазоў гною, 500 тон торфу, 50 цэнтнераў попелу. Калгас забяспечан высокаякасным, чыстаным насеннем.

Або вось калгас «Першае мая», Слуцкага раёна. У мінулым годзе тут атрыманы высокі ўраджай. На працадзень калгаснікі атрымалі па 3,2 кгр. зернавых, 12 кгр. бульбы і 3 руб. 70 кап. грашыма. Уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай, калгаснікі абавязаліся атрымаць у 1938 годзе сярэдні ўраджай зернавых не менш 20 цэнтнераў з гектара і бульбы—225 цэнтнераў. Калгаснікі цвёрда рашылі змагацца за багаты працадзень—5 кгр. зернавых, 16 кгр. бульбы і 4 рублі грашыма. Калгас узорна рыхтуецца да веснавой сяўбы.

У калгасе імя Варашылава, Віцебскага раёна, соцыялістычнае спаборніцтва па лепшай падрыхтоўцы да вясны ўзначальвае намеснік старшыні калгаса, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР Кірыла Пятаповіч Власенкаў. Кожны калгаснік збірае 1,5 цэнтнера попелу. Насенне пратручана праз трыер. Тав. Власенкаў абавязаўся ў дні, што засталіся да першай сесіі Вярхоўнага Совета СССР, вывезці на калгасныя палі не менш 25 тон гною і 20 тон торфу, завяршыць рамонт плугоў і збруі. Арганізуецца гурток па вывучэнню агратэхнікі.

Прыклады разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва за ўзорную падрыхтоўку да веснавой сяўбы можна прывесці з калгаса «Соцыялізм», Шклоўскага раёна, «III Інтэрнацыянал», Асіпавіцкага раёна, «Рассвет», Жлобінскага раёна, і іншых.

Але пакуль такіх калгасаў мала. У большасці калгасаў, соўгасаў і МТС рэспублікі соцыялістычнае спаборніцтва не арганізавана. Партыйныя, комсамольскія і совецкія арганізацыі не ўзначалілі соцыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху за высокі ўраджай. Іменна ў гэтым прычына нецярпімага адставання ў рэспубліцы па падрыхтоўцы да сяўбы, што зусім правільна адзначана ў рашэнні Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б). Пад пагрозу зрыву пастаўлены такія важнейшыя і неадкладныя работы, як рамонт трактараў, выбарка гаручага, засыпка і ачыстка насення і абмен сартавога насення на радковае.

Учора мы апублікавалі зводку Наркамзема БССР аб ходзе засыпкі і ачысткі насення па раёнах рэспублікі. Зводка паказвае, што ў большасці раёнаў рэспублікі не прыняты меры, каб ліквідаваць адставанне ў падрыхтоўцы да сяўбы. Асабліва выклікае трывогу становішча з засыпкай, ачысткай і абменам насення ў Сіроцінскім, Чэрвеньскім, Полацкім, Любаньскім, Бялыніцкім, Глускім, Дубровенскім, Жлобінскім, Заслаўскім і Кармянскім раёнах. Замест арганізацыі мас калгаснікаў на ліквідацыю адставання, партыйныя і совецкія кіраўнікі гэтых раёнаў займаюцца пустымі разважаннямі.

Кіраўнікі некаторых партыйных арганізацый рэспублікі сталі на шкодны, шмат разоў асуджаны партыяй, шлях замены сапраўднага соцыялістычнага спаборніцтва параднай шуміхай. Такія гора-кіраўнікі ў патоках агульных рэзалюцый і пустых дэкларацый топяць жывую справу соцыялістычнага спаборніцтва. Прыкладам можа служыць досыць дзіўная пазіцыя, занятая Чэрвеньскім райкомам КП(б)Б. Тут нядаўна сабралі раённую нараду старшынь калгасаў, на якой не паскупіліся на самаабавязацельствы. Па думцы сакратара РК КП(б)Б тав. Касцюковіча, гэта і ёсць соцспаборніцтва мас. Бюракраты з райкома складаюць зводкі пра ахоп усіх калгасаў раёна соцыялістычным спаборніцтвам. На самай-жа справе — амаль ні ў адным калгасе калгаснікі не ведаюць пра самаабавязацельствы сваіх старшынь. На агульных сходах калгаснікаў мерапрыемствы па барацьбе за ўраджай не абмяркаваны, соцыялістычнае спаборніцтва не разгорнута.

Ці не ясна, што сакратар Чэрвеньскага райкома партыі літаральна нічога не зразумеў у ленінскім соцыялістычным спаборніцтве? На жаль, кіраўніцтва Чэрвеньскага раёна не ёсць выключэнне.

Соцыялістычнае спаборніцтва павінна разгарнуцца знізу, — у звеннях, у брыгадах, паміж калгасамі, брыгадамі і т. д. Справа ідзе аб жывой, практычнай большэвіцкай рабоце па ўзначальванню палітычнага і вытворчага ўздыму мас, па перадачы вопыту перадавых адстаючым, па падцягванню апошніх.

Задача іменна ў тым і заключаецца, каб соцыялістычным спаборніцтвам ахапіць літаральна ўсе калгасы, соўгасы і МТС, дапамагчы адстаючым ліквідаваць сваё адставанне і ва ўсеўзбраенні сустрэць веснавую сяўбу. «Соцыялістычнае спаборніцтва гаворыць: адны працуюць дрэнна, другія добра, трэція лепш, — **дагоняй лепшых і дабіся агульнага ўздыму» (Сталін).** Варта гэтае сталінскае ўказанне яшчэ і яшчэ раз напомніць многім нашым работнікам.

Вызначыўшы ў сваім рашэнні канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі адставання ў падрыхтоўцы да сяўбы, СНК СССР і ЦК ВКП(б) абавязалі партыйныя і совецкія арганізацыі «арганізаваць шырока і з належным штодзённым кіраўніцтвам спаборніцтва калгасаў і соўгасаў за лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Звярнуць асаблівую ўвагу на ўмацаванне жывой сувязі партыйных арганізацый з калгасным актывам і стаханаўцамі»

Выканаць гэтае ўказанне Цэнтральнага Камітэта партыі і саюзнага ўрада, дапамагчы кожнаму калгасу, соўгасу і МТС шырока разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва і стаханаўскі рух за ўзорную падрыхтоўку да веснавой сяўбы, за новыя перамогі соцыялістычнага земляробства— вось баявая і гапаровая задача партыйных, комсамольскіх і совецкіх арганізацый, задача большэвіцкага друку.

Вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва за ўзорную падрыхтоўку да веснавой сяўбы!

ПЕРАД СЕСІЯЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

НАКАЗЫ ВЫБАРШЧЫКАЎ СВАІМ ДЭПУТАТАМ

ХАБАРАЎСК, 5 студзеня. (БЕЛТА). На першую сесію Вярхоўнага Совета СССР выехалі дэпутаты: сучанскі шахцёр тав. П. С. Чэрпак, сахалінскі лесаруб тав. С. Т. Петухоў і інш. Кожны дэпутат атрымаў наказ ад сваіх выбаршчыкаў. Ва ўсіх наказах ёсць адзін агульны пункт: «Перш за ўсё, як толькі ўбачыце дарагога Іосіфа Бісарыёнавіча Сталіна, перадайце яму палкае прывітанне і вялікае гарачае дзякуй за радаснае, шчаслівае жыццё».

Выбаршчыкі просяць перадаць прывітанне вялікаму Сталіну, прывітанне яго вернаму сарэтніку таварышу Молатаву, Цэнтральнаму Камітэту ВКП(б) і совецкаму ўраду.

Калгаснікі калгаса «ВЧК», Міхайлаўскага раёна, Усурыйскай вобласці, пішуць у сваім наказе дэпутатам тт. Блюхеру і Чэрпак:

— Мы наказваем вам падтрымліваць паслядоўную палітыку міру, але калі фашысцкія разбойнікі захочуць парушыць мір і напасці на нас, тады ад імя совецкага народа, ад імя сваіх выбаршчыкаў папярэдзьце фашысцкіх заправілаў, што на абарону совецкай зямлі стане не толькі наша слаўная Чырвоная Армія, але і ўсе працоўныя совецкай краіны.

Усе наказы прасякнуты адзіным патрабаваннем, звернутым да дэпутатаў: будзьце цвёрдымі і бясстрашнымі ў барацьбе з ворагамі народа — трацкісцка-бухарынскімі і іншымі фашысцкімі наймітамі.

ПА СТАПАХ ІВАНА ГУДАВА

ГОРКІ, 4 студзеня. (БЕЛТА). Метады работы знатнага маскоўскага стаханаўца тав. Гудава ўжыты на горкаўскім станкабудаўнічым заводзе. Учора стаханавец-фрэзероўшчык тав. Ганохін на працягу 3,5 гадзін апрацоўваў пры дапамозе спецыяльных прыстасаванняў дэталь для станка і выканаў норму на 1.536 проц. Да гэтага часу ён выконваў норму на 250—270 проц.

МАДРЫДСКАЯ АБЛАСНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ КОМПАРТЫІ ІСПАНІІ

БАРСЕЛОНА, 5 студзеня. (БЕЛТА). 3 студзеня адкрылася Мадрыдская абласная канферэнцыя комуністычнай партыі Іспаніі.

Выступаўшая на канферэнцыі Даларэс Ібаруры ўказала на неабходнасць падтрымлівань урад народнага фронта і ў прыватнасці палітыку міністэрства земляробства. Перайшоўшы да пытання аб дзейнасці «пятай калоны», Ібаруры заявіла, што ў апараце органаў юстыцыі яшчэ многа асоб, перашкаджаючых барацьбе з трацкісцкімі шпіёнамі, шкоднікамі і дыверсантамі.

Урад, — заявіла Ібаруры, — мае дастаткова доказаў сувязей іспанскіх трацкістаў з Франко. Ібаруры падкрэсліла неабходнасць узмацнення барацьбы з трацкістамі.

Даларэс Ібаруры патрабавала, каб Усеагульны Рабочы Саюз (ВРС), Нацыянальная Канфедэрацыя працы і ўрад прынялі меры па паляпшэнню становішча рабочых і сумесна выпрацавалі новыя тарыфныя стаўкі. Указаўшы, што адзінства з соцыялістычнай партыяй і ўмацаванне адзінства ўнутры ВРС з'яўляецца адной з асноўных задач комуністычнай партыі, Даларэс Ібаруры заявіла, што комуністы праводзяць барацьбу з Ларго Кабальеро таму, што ён — вораг адзінства.

Далей Ібаруры адзначыла актыўны ўдзел жанчын у барацьбе супроць мяцежнікаў і інтэрвентаў.

Канферэнцыя прыняла прывітанні таварышу Сталіну, сакратару ЦК компартыі Іспаніі Хозе Дыясу, генералам Міяха і Лістэру.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ (арагонскі) ФРОНТ

Атакі, прадпрынятыя 4 студзеня мяцежнікамі супроць правага фланга рэспубліканскіх войск, былі адбіты.

Першая атака была прадпрынята пры падтрыманні танкаў на пазіцыі рэспубліканцаў у Эль-Мулетон. Падпусціўшы мяцежнікаў на блізкую дыстанцыю, рэспубліканскія войскі адкрылі аружэйны і кулямётны агонь, у рэзультаце якога мяцежнікі адступілі ў беспарадку, пакінуўшы на полі бою многа забітых і раненых.

Другая атака была прадпрынята мяцежнікамі пры падтрыманні танкавых часцей з Канкуда. Адбіўшы і гэту атаку, рэспубліканскія войскі змаглі прасунуцца наперад.

На левым флангу мяцежнікі прабавалі атакаваць вышыні 1062 і 1076, але былі адбіты.

У ноч на 5 студзеня ў раёне Эль-Мулетон зноў завязаўся жорсткі бой.

Як паведамляе спецыяльны карэспандэнт агенцтва Гавас, на працягу апошняга тыдня пад Тэруэлем разгураўся бой, самы трандыёзны з усіх, меўшых месца ў часе вайны ў Іспаніі. Мяцежнікі прабавалі абрушыцца на Муэла дэ Тэруэль, каб прарвацца к гораду. Ім удалося заняць гэту вышыню 31 снежня. Аднак, рэспубліканскія войскі абходным рухам паставілі пад пагрозу акружэння часці мяцежнікаў, якія павінны былі падтрымаць наступленне на Тэруэль. На працягу трох апошніх дзён становішча на фронце стабільна.

Карэспандэнт заяўляе, што мяцежнікі вымушаны былі зняць некаторыя часці, якія былі імі падрыхтаваны для задуманага ў другім напрамку наступлення, і перакінуць іх к Тэруэлю. Рэспубліканскія войскі зноў пачынаюць браць ініцыятыву ў свае рукі. У раёне Тэруэля 4 студзеня быў збіт знішчальнік мяцежнікаў.

НЕПЕРАЎЗЫЙДЗЕНЫ ЎЗОР НАГЛАСЦІ ДРАПЕЖНІКА

ЗАЯВА ЯПОНСКАГА МІНІСТРА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ

ПАРЫЖ, 4 студзеня. (БЕЛТА). Французскі друк перадае інтэрв'ю, дадзенае японскім міністрам унутраных спраў адміралам Суэцугу супрацоўніку японскага журнала «Кайдзо». У гэтым інтэрв'ю Суэцугу з крайняй развязнасцю выказваецца аб японскіх планах на Далёкім Усходзе. Развіваючы планы стварэння праяпонскіх марыянетачных урадаў не толькі ў Паўночным, але і ў Паўднёвым Кітаі, Суэцугу заявіў, што «як нас абавязвае на гэта імператарскі рэскрыпт, інтарэсы белых расаў на Далёкім Усходзе павінны стушаваць перад «японскай місіяй». Кітай, Манчжоу-Го і Японія павінны стварыць «палітычны, эканамічны і ідэалагічны блок».

Гаворачы далей аб місіі Японіі, Суэцугу заявіў: «Я ўпэўнен, што жоўтая раса выйграе шчасце, якое ёй прадаставіла неба, і што наступіць канец гегемоніі белых рас. Прыпінчанне белымі расамі жоўтых рас павінна знікнуць».

«Каб зламаць кітайскае супраціўленне, — сказаў далей Суэцугу, — абсалютна неабходна спыніць англійскую дапамогу Кітаю, быць можа, нават праз вайны».

***

ПАРЫЖ, 4 студзеня. (БЕЛТА). Новая заява японскага міністра ўнутраных спраў адмірала Суэцугу, раскрываючая аб'ём імперыялістскіх апетытаў японскай ваеншчыны, прыцягнула вялікую ўвагу ўсяго французскага друку. Газеты падкрэсліваюць, што падобны стыль выступлення члена ўрада амаль не мае прыкладаў.

Як канстатуе газета «Пашолер», «праграма Суэцугу пераўзыходзіць па свайму размаху і па сваёй нагласці нават славуты план Танака 1927 года».

«Цяпер вядома, — піша газета. — чаму Японія прадпрыняла сваю «карную экспедыцыю» ў Кітаі. Яна і ўяўляе сабою толькі першы этап крыжовага паходу супроць заходніх дзяржаў».

Ва ўсякім выпадку, заява адмірала Суэцугу будзе мець тую карысць, што яна ліквідуе або павінна будзе ліквідаваць заявы японскіх дзеячоў аб «антыкомуністычным» характары вайны ў Кітаі. Зараз афіцыйна вядома, што мэтаю вайны, якую Японія вядзе ў Кітаі, з'яўляецца не барацьба супроць комунізма, але барацьба супроць Англіі і Францыі, барацьба за выгнанне гэтых дзяржаў з азіяцкага кантынента.

Ігра робіцца больш яснай і больш грубай. Маскі падаюць і, быць можа, гэта дапаможа заходнім дэмакратыям больш рэальна ацаніць становішча, якое стварылася на Далёкім Усходзе».

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

ХАНЬКОЎ, 5 студзеня. (БЕЛТА). У рэзультаце паспяховага контрнаступлення, кітайскія войскі ў правінцыі Аньхуэй значна прасунуліся, вымусіўшы японскія часці адступіць са стратэгічна важных пунктаў — гарадоў Уху і Сюаньчан.

***

ХАНЬКОЎ, 5 студзеня. (БЕЛТА). Учора 12 японскіх бамбардыроўшчыкаў і некалькі знішчальнікаў зрабілі налёт на Ханькоў. 64 бомбы было скінута на аэрадром і каля 30 — на іншыя кварталы. Забіта і ранена 13 чалавек. Японцы прабавалі таксама бамбардыраваць Ханьянскі арсенал, але ён не пацярпеў. Адна бомба папала ў школу ўпоблізу арсенала.

Японскія самалёты падпалі пад узмоцнены абстрэл з зенітных гармат. Над горадам адбыўся паветраны бой.

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

ХАНЬКОЎ, 5 студзеня. (БЕЛТА). Агенцтва Сентрал Ньюс паведамляе, што ў паўднёвай частцы правінцыі Хэбей кітайскія войскі выбілі японцаў з Цынфына і Напіло. Кітайскімі войскамі адбіта атака японцаў на Пуян. Японскія войскі адступілі к Даміну.

Агенцтва Сентрал Ньюс паведамляе, што ў Цзіньсэ (на поўдзень ад Тайюані) паўстаў атрад манчжурскіх войск, перакінуты тулы японцамі з Манчжурыі. Атрад перайшоў на бок кітайскіх партызан. У 10 кілометрах на поўдзень ад Тайюані (правінцыя Шаньсі) аперуе буйны кітайскі партызанскі атрад.

РОСТ ЗАБАСТОВАЧНАГА РУХУ Ў ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 4 студзеня. (БЕЛТА). Апублікаваны новыя афіцыяльныя даныя аб забастовачным руху ў Польшчы. У першым паўгоддзі 1937 года было зарэгістравана 1.089 забастовак супроць 1.022 у першым паўгоддзі 1936 года. У першым квартале 1937 года было 419 забастовак, ахапіўшых 117 тысяч рабочых, а ў другім—670 забастовак, ахапіўшых 139 тысяч рабочых.

Найбольшую колькасць забастовак паказвае горная прамысловасць (168), лесапільная (160), тэкстыльная (123), будаўнічая (137) і металургічная (102).

АНТЫПОЛЬСКІЯ ВЫСТУПЛЕННІ ФАШЫСЦКІХ ЗАПРАВІЛАЎ ДАНЦЫГА

ВАРШАВА, 4 студзеня. (БЕЛТА). «Варшаўскі дзённік народовы» паведамляе аб новых нахабных антыпольскіх выступленнях данцыгскіх гітлераўцаў. Газета прыводзіць вытрымкі з новагодніх артыкулаў, змешчаных у гітлераўскім афіцыёзе «Данцыгер фарпостэн» і напісаных старшынёю данцыгскага сената Грэзерам і кіраўніком данцыгскіх фашыстаў Форстэрам.

У артыкуле Форстэра, у прыватнасці, гаворыцца: «Не будзе і не можа быць ніякой розніцы паміж жыццём Германіі і адарваным ад яе Данцыгам. На жаль, Версальскі і рад іншых дагавораў прымушаюць нас арыентавацца ў эканамічным жыцці на Польшчу. Няма патрэбы асобна падкрэсліваць, у якой ступені такое становішча з'яўляецца нецярпімым для германскага Данцыга... Наша канчатковая мэта—утрымаць Данцыг, як фарпост Германіі на ўсходзе над Віслай, каб у любы момант перадаць яго у распараджэнне «фюрэра» (г. зн. Гітлера)».

Дэпутат Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР тав. Іваноў Аляксандр Іванавіч. 26 снежня тав. А. І. Іваноў выбран выконваючым абавязкі старшыні Магілеўскага гарадскога совета.

ПЕРАПІС ЖЫВЁЛЫ ПА БССР

На працягу пяці дзён каля 3.900 пічотчыкаў абходзяць калгасныя фермы, двары калгаснікаў, аднаасобнікаў, жыхароў мястэчак і гарадоў Совецкай Беларусі, праводзячы перапіс жывёлы. З першага-ж дня перапісу многія пічотчыкі заключылі паміж сабой дагаворы на соцыялістычнае спаборніцтва, каб своечасова і дакладна правесці перапіс і поўна ахапіць усю маючуюся жывёлу як у калектыўным, так і ў індывідуальным карыстанні.

Але не ўсюды да гэтай важнейшай дзяржаўнай справы па-сур'ёзнаму адносіцца як раённыя арганізацыі, так і кіраўнікі сельсоветаў і самі пічотчыкі.

У Замачанскім сельсавеце, Асіпавіцкага раёна, пічотчыкі праводзілі перапіс жывёлы са слоў, без праверкі ў натуры. У выніку па гэтаму сельсовету прышлося перапіс адмяніць. Таксама безадказна аднёсся да перапісу жывёлы пічотчык Сілівончык (Парыцкі раён). Перапіс, праведзены ім са слоў па пасёлках Громаўка і Украіна, таксама прышлося адмяніць.

Ёсць асобныя факты ўтойвання жывёлы ад перапісу. Так, у Сіроцінскім раёне член Мішкаўскага сельсавета Іван Карнакоў імкнуўся ўтоіць ад перапісу авечку. Старшыня калгаса імя Кірава, Дабейскага сельсавета, Іван Юрчанка, утоіў сёння, а пічотчык Прахор Шайлінскі ўтоіў сваіх двух парасят.

Гэтыя факты сігналізуюць аб тым, што не ва ўсіх раёнах рэспублікі дастаткова была праведзена масава-растлумачальная работа па задачах, якія стаяць перад ўсесаюзным перапісам жывёлы. Класава-варожыя элементы імкнуцца падарваць работу па перапісу.

Там, дзе насельніцтву дакладна растлумачылі задачы перапісу, пічотчыкаў надзвычай радушна сустракаюць. Калгаснікі з асаблівым задаваленнем паказваюць пічотчыкам шматлікую жывёлу, якую яны маюць у сваім індывідуальным карыстанні.

І гэта не дзіва. Няспынны рост заможнасці калгаснікаў разам з развіццём калгасных ферм выклікае рост пагалоўя жывёлы ў індывідуальным карыстанні калгаснікаў. Пічотчыкі вельмі рэдка знаходзяць такую калгасную гаспадарку, якая-б не мела ў сваім карыстанні карову, падцёлка, свіней, авечак. Так, напрыклад, на 1 студзеня 1937 г. у індывідуальным карыстанні калгаснікаў, Замастоцкага сельсавета, Менскага раёна, было 146 кароў. Выніку перапісу паказалі, што колькасць кароў на працягу года павялічылася да 175 галоў. У калгаснікаў Станькаўскага сельсавета колькасць кароў узрасла з 586 галоў да 631 галавы і т. д.

Да канца ўсесаюзнага перапісу жывёлы асталося тры дні. Па папярэдніх вестках рад раёнаў, як Багушэўскі, Сіроцінскі, Плешчаніцкі і інш. ужо закончылі перапіс жывёлы. Па ўсіх раёнах зараз праходзяць кантрольныя абходы. Па няпоўных даных па 5 раёнах рэспублікі: Камарынскім, Асвейскім, Ушацкім, Жлобінскім і Смілавіцкім выяўлены нязначныя ўкрыцці жывёлы. Задача як пічотчыкаў, так і брыгад кантрольнага абходу — перапіс жывёлы правесці з поўным улікам усяго пагалоўя.

НАРАДА МАЛАДЫХ СТАХАНАЎЦАЎ У ЦК ВЛКСМ

4 студзеня адкрылася скліканая Цэнтральным Камітэтам комсамола нарада маладых стаханаўцаў, інжынераў, тэхнікаў і кіраўнікоў маладзёжных брыгад Масквы, Ленінграда, Данбаса, Чэлябінска, Свердлоўска, Харкава, Горкага і іншых гарадоў Совецкага Саюза.

На нарадзе прысутнічаюць знатныя людзі краіны — сталявар Марыупальскага завода імя Ільіча тав. Макар Мазай, сталявар Кузнецкага завода імя Сталіна тав. Васеў, забойшчык шахты «Красный Профинтерн» тав. Залататрубаў, слесар Мыцішчынскага вагонабудаўнічага завода тав. Крац і іншыя.

Адзін за другім падыходзяць да трыбуны маладыя стаханаўцы. Яны расказваюць аб металах сваёй работы, аб дасягненнях у павышэнні прадукцыйнасці працы, аб дапамозе комсамольскіх арганізацый стаханаўцам, аб рабоце з несаюзнай моладдзю.

5 студзеня на пасяджэнні выступілі сталявар тав. Макар Мазай, начальнік доменнага цэха Кузнецкага металургічнага завода імя Сталіна тав. Грыцун, стаханаўка Ленінградскай фабрыкі «Красное знамя» тав. Мазгавая, інжынер Харкаўскага турбагенератарнага і электрамеханічнага завода імя Сталіна тав. Поздрэў і іншыя.

У рабоце нарады прымаюць удзел кіруючыя работнікі ЦК ВЛКСМ.

5 студзеня на нарадзе прысутнічаў сакратар ЦК ВКП(б) таварыш А. А. Андрэеў.

НАРАДА АКТЫВІСТАК—ХАТНІХ ГАСПАДЫНЬ

Учора ў менскім Доме партактыва адбылася скліканая ГК КП(б)Б агульнагарадская нарада актывістак — хатніх гаспадынь. Прысутнічала 500 чалавек. Нарада была прысвечана вынікам выбараў у Вярхоўны Совет СССР і далейшым задачам палітмасавай работы сярод працоўных. З вялікай цікавасцю прысутныя заслухалі даклад свайго дэпутата ў Совет Нацыянальнасцей тав. Ванеева. Апошнія словы даклада, прысвечаныя вялікаму правадыру працоўных таварышу Сталіну, выклікалі поўную захапленне авацыю. Усе стоячы віталі партыю Леніна—Сталіна, любімага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна.

Адна за другой на трыбуну падымаліся актывісткі — хатнія гаспадыні. Выступілі тт. Станілевіч, Сухаверка, Масюк, Хмялеўская, Гладкая, Шкірыч, Бамвель (агітатар, хатняя гаспадыня) і інш. Іх выступленні паказалі, як яны палітычна выраслі за час выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Актывісткі дзяліліся вопытам праробленай работы, расказалі, з якімі радаснымі пачуццямі яны сустракаюць першую сесію Вярхоўнага Совета СССР і выказалі сваю гатоўнасць прымаць самы актыўны ўдзел у надыходзячых выбарах у Вярхоўны Совет БССР. Разам з тым, усе яны патрабавалі яшчэ большага ўзмацнення масава-палітычнай работы з хатнімі гаспадынямі.

У кожным выступленні гучала бязмежная любоў да любімага правадыра народаў таварыша Сталіна за радаснае і шчаслівае жыццё.

У канцы нарады выступіў сакратар Менскага гаркома КП(б)Б тав. Мацвееў.

АРГАНІЗУЕМ СОЦСПАБОРНІЦТВА ЗА ВЫСОКІ УРАДЖАЙ

СПАБОРНІЦТВА ДВУХ КАЛГАСАЎ

КРУПКІ. Першымі ў социялістычнае спаборніцтва на большэвіцкую падрыхтоўку і правядзенне веснавой сяўбы ўключыліся калгасы імя Стаханава Крупскага местсовета і імя Варашылава, Крупскага сельсовета.

У 1937 годзе калгаснікі калгаса імя Стаханава атрымалі на працадзень па 3 кг. зернавых, 9 кг. бульбы, 5 кг. гародніны, поўлітра малака і грашыма 1 р. 25 к. Цяпер калгаснікі змагаюцца за тое, каб у першым годзе трэцяй сталінскай пяцігодкі заваяваць новыя перамогі.

Ужо зараз калгас засыпаў поўнасцю насенныя фонды добразякасным насеннем. Зярно ачышчана. Ад кожнай культуры даны пробы ў насенна-кантрольную лабараторыю. Звычайнае ільнасемя здана на абмен на гатунковае. Сельскагаспадарчы інвентар адрамантаваны. Зараз праводзіцца рамонт збруі.

Калгас рыхтуе да вясны коней. Слабасільныя коні пастаўлены пад асобны нагляд; ім дан узмоцнены рацыён. Штодзённа коні чысцяцца. Каб атрымаць высокі ўраджай, калгаснікі выключную ўвагу звярнулі на збор угнаення. За студзень абавязаліся загатовіць і вывезці торфу 100 тон, мясцовага ўгнаення і фекалія — 6 тон. Кожны калгасны двор збірае не менш, як па 50 кілограмаў попелу, што складае ўвогуле па калгасу 5 тон. Закуплена і вывозіцца 20 тон мінеральных угнаенняў.

Калгаснікі абавязаліся сабраць ураджай жыта не менш 15 цэнтнераў з гектара і ячменю 18 цэнтнераў з гектара.

Калгаснікі калгаса імя Варашылава абавязаліся ў першай палове студзеня закончыць рамонт усяго сельскагаспадарчага інвентару. Да пачатку пасеўнай сабраць не менш 15 тон попелу. Апрача гэтага вясной будзе наладжан збор попелу з дзялянак.

З кожнага калгаса вылучана па 5 чалавек для сістэматычнай праверкі выканання дагавора. Першая праверка будзе зроблена 15 студзеня.

10 студзеня райком партыі склікае раённую нараду стаханаўцаў сельскай гаспадаркі па пытанню разгортвання соцспаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і правядзенне веснавой сяўбы.

МІРОНАЎ.

Узорна падрыхтуемся да сяўбы

Калгаснікі нашай сельгасарцелі «Гром», (Будакашалёўскі раён) звярнуліся з заклікам да ўсіх калгаснікаў раёна арганізаваць социялістычнае спаборніцтва на ўзорную падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

З свайго боку, для выканання пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб падрыхтоўцы да сяўбы і ў адказ на зварот перадавых калгасаў Маскоўскай вобласці мы ўзялі наступныя абавязацельствы: да 15 студзеня скончыць рамонт сельскагаспадарчых машын і інвентару, за зімовы перыяд вывезці на поле 3.000 вазоў гною, вывезці са станцыі 900 цнт. мінеральнага ўгнаення, загатовіць 1000 тон торфу, сабраць 120 цнт. попелу. Усе яравыя 1938 г. пасеяны выключна па ўгноенай глебе.

Мы паставілі перад сабой задачу дабіцца ў гэтым годзе сярэдняга ўраджаю па калгасу: жыта 15 цнт., пшаніцы 15 цнт., ячменю 20 цнт., аўсу 18 цнт., бульбы 225 цнт., ільнавалакна 6 цнт. і ільнасемя 7 цнт.

Для таго, каб атрымаць гэты высокі ўраджай, мы зрабілі наступнае. Яшчэ з восені мінулага года падняслі ўсю глебу пад зяблева, рассыпалі мінеральнае ўгнаенне: фасфарытную муку пад авёс на плошчы 41 гектара і сільвініт пад лён на плошчы 33 гектараў.

Як толькі скончылі ўборку—абмалацілі збожжавыя і засыпалі ў насенны фонд. Усё насенне—гатунковае. Зараз насенне поўнасцю пралушчана праз трыер. Праверка паказала, што чыстата яго даходзіць да 99 проц. Насенне захоўваецца ў чыстым і сухім свірне.

Сельскагаспадарчыя машыны і інвентар таксама поўнасцю адрамантаваны. Знаходзяцца ў спраўнасці 4 сеялкі, 32 плугі, бароны, збруя. Зараз рамантуем калёсы. На рамонце ўвесь час працуе спецыяльная брыгада.

Торфу ўжо загатоўлена 300 тон і сабрана 32 цнт. попелу. Калгаснік Сямён Паўлюкоў з'яўляецца лепшым арганізатарам па збору попелу. Да 1 лютага мы вывезем на поле ўвесь маючыйся гной.

Асаблівую ўвагу наш калгас звярнуў на падрыхтоўку цяглавай сілы да веснавой сяўбы. Усе 83 коні сярэдняй упітанасці. За коньмі наладжан добры догляд, кожны дзень праводзіцца чыстка. На час веснавых работ для коней пакінут лепшы корм: па 2 цнт. аўсу і 4 пнт. сена.

Сярод калгаснікаў па брыгадах і звенях разгортваецца соцспаборніцтва па лепшай падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Брыгады і звенні намячаюць канкрэтныя мерапрыемствы па лепшай арганізацыі сяўбы. Усе калгаснікі змагаюцца за тое, каб на працадзень атрымаць не менш 6 кілограмаў зернавых, 20 кілограмаў бульбы, 2 рублі грашыма.

Можна сказаць з упэўненасцю, што свае абавязацельствы мы выканаем, узорна падрыхтуемся да веснавой сяўбы першага года трэцяй сталінскай пяцігодкі і забяспечым высокі ўраджай і працадзень калгасніка.

Ягор Сцяпанавіч ВЕРАЧЫНСКІ,
брыгадзір калгаса «Гром», Будакашалёўскага раёна.

Больш увагі падрыхтоўцы да сяўбы

Набліжаецца веснавая пасеўная кампанія. Здавалася-б, што гэта павінна было прымусіць праўленне калгаса «Чырвоны баец», Малевіцкага сельсовета Жлобінскага раёна, неадкладна пачаць энергічную падрыхтоўку.

Аднак яшчэ і зараз у калгасе зернавыя культуры не абмалочаны. Калі будуць малаціць — невядома. Сельгасінвентар — тры малацілкі, тры жняркі — паломаны і прыведзены ў нягоднасць Аб рамонце і не думаюць.

Сцены гумнаў, дзе захоўваецца збожжа, распягваюцца на дровы, бо ў калгасе няма саней і калёс, калгаснікам няма на чым прывезці дроў.

Не лепш справа і з кармамі. Сена першага і другога ўкосу з урочышча Аблонь разбазарана, салома пагноена. Усё гэта не турбуе праўленне калгаса. Старшыня Байкачоў бязэйнічае, пусціў усю справу на самацёк.

ГРОМАЎ.

Прыліў у калгасы

У радзе калгасаў Хойніцкага раёна наглядаецца прыліў аднаасобнікаў у калгасы. У калгас «Чырвоная змена», Небытаўскага сельсовета, 26 снежня 1937 года прыняты 3 аднаасобнікі, у калгас «Социялізм», Корчаўскага сельсовета, — 2 аднаасобнікі. Ёсць прыліў і ў калгасы Маканавіцкага, Дварышчанскага і іншых сельсоветаў. Аднаасобнікі, якія ўступаюць у калгасы, абавязваюцца працаваць па-стаханаўску, каб добра падрыхтавацца да веснавой сяўбы.

Л. МАКАРАЎ.

НЕ РЫХТУЮЦЬ НАСЕННЯ

Не клапоцяцца ў Менскім раёне аб падрыхтоўцы насення да сяўбы. Гэта важная работа выпала з поля зроку менскіх раённых арганізацый. У рэзультаце такой бесклапотнасці па калгасах раёна на 1 студзеня не закончана поўнасцю засыпка насення па зернавых культурах і бульбе, план засыпкі насення капюшыны выканан толькі на 32,6 проц., лубіну — 15,4 проц.

У радзе калгасаў засыпка насення затрымліваецца з-за таго, што не скончан абмалот. МТС не клапоцяцца аб завяршэнні абмалоту ў абслугоўваемых імі калгасах.

Дрэнна і з ачысткай насення. На 1 студзеня ачышчана збожжавых усяго толькі 15 проц. У калгасах 20 сельсветаў раёна яшчэ да гэтай пары не прыступілі да ачысткі насення праз трыер Насенне ачышчаецца нядобраякасна. Вось што гаворыць лабарантка райза тав. Зіскіна, працуючая па праверцы пасеўнага матэрыялу на чыстату і ўсхожасць:

— Нам на праверку прыслалі пробы насення 23 калгасы з 107. Па чыстаце ўсе прадстаўленыя пробы насення аказаліся некандыцыйнымі. Гарох калгаса імя Кастрычніцкай рэволюцыі, Ратамскага сельсовета, мае толькі 85 проц. чыстаты, гатунковая пшаніца — толькі 93 проц.

У радзе калгасаў раёна няма барацьбы за захаванне насення. Насенныя фонды засыпаны ў непрадэзінфектаваных свірнах. У рэзультаце — шмат насення заражана кляшчом.

У калгасе імя Варашылава, Ратамскага сельсовета, заражана кляшчом насенне пшаніцы, канапель, аўса. У калгасе «Чырвоны барацьбіт» клешч точыць ячмень. Заражан кляшчом і пасеўны матэрыял калгаса «1-е Мая», Кайкаўскага сельсовета, калгаса «Першы з'езд калгаснікаў», Падгайскага сельсовета, і калгаса «Звязда», Строчыцкага сельсовета.

Аб фактах некандыцыйнасці насення, яго заражанасці кляшчом, дрэннай усхожасці чамусьці ведае толькі лабарантка. Гэтымі сур'ёзнымі сігналамі не цікавіцца загалчык райза т. Клеўка і аграном т. Гарбацэвіч. Ніхто з іх не прымае аператыўных мер да таго, каб забяспечыць калгасы поўнацэнным пасеўным матэрыялам.

Даўно ўжо наступіла пара разгарнуць міжкалгасны абмен гатунковага насення на радковае. Гэтаму спрыяе выдатная санная дарога. А між тым, гатункаабмен ў раёне не арганізован. З 129 калгасаў, якія павінны абмяняць радковае насенне на гатунковае, абмянялі, і то часткова, толькі 12 калгасаў. Калгас «Перамога». Папярнянскага сельсовета, і да гэтага дня не ведае, дзе яму абмяняць 65 цэнтнераў аўса. Старшыня калгаса тав. Бацян абівае парогі райземаддзела, а толку ніяк дабіцца не можа.

Кіраўніцтва раду калгасаў нядобрасумленна адносіцца да абмену простага зярна на гатунковае. Прывозяць суселнім калгасам на абмен зярно са смецем, не ачышчанае. Такі недапушчальны факт быў з боку старшыні калгаса «Чырвоны будаўнік» Сенніцкага сельсовета тав. Айзікава, які прывёз у калгас «Другая пяцігодка», Грычынскага сельсовета, для абмену пяць пазод засмечанага, зусім неачышчанага аўса.

Добрае насенне — залог высокага ўраджаю. Гэту ісціну разумеюць і ў Менскім райземаддзеле, але далей слоў не ідуць.

СНК СССР і ЦК ВКП(б) прапанавалі правесці з 5 па 15 студзеня па ўсіх калгасах дасканалую праверку якасці засыпанага насення. Але ў калгасах Менскага раёна да праверкі не прыступаюць. У райземаддзеле толькі раскачваюцца, пішуць чарговыя дырэктывы замест таго, каб мабілізаваць людзей і дапамагчы калгасам забяспечыць пасеў 1938 года высокагатунковым насеннем.

Г. ВЯРХОЎСКІ.



Рамонт трактараў у Менскай МТС. **На здымку:** лепшыя стаханаўцы тт. Е. П. Бладыка і А. Ф. Піткевіч, датэрмінова выканаўшыя план чацвертага квартала 1937 года па рамонту матораў трактараў. Фото Гаравога (БСФ).

ЯК МЫ ДАБІЛІСЯ РЭКОРДНАЙ ВЫПРАЦОЎКІ

На бабруйскім машынабудаўнічым заводзе імя Сталіна я працую слесарам уже пяць гадоў. За ўвесь час маёй работы я заўсёды быў у ліку перадавых рабочых, выконваўшых і перавыконваўшых свае задані.

Выдатны стаханаўскі рух, які ахапіў усю нашу краіну, усіх працоўных, параздіў новых людзей, якія даюць небывалыя паказальнікі прадукцыйнасці працы. Стаханаўскі рух шырока ахапіў і наш завод. Я з першых дзён стаў стаханаўцам. Зараз на нашым заводзе налічваецца 140 стаханаўцаў.

Рыхтуючыся да выбараў у Вярхоўны Совет Саюза ССР я ўсяляк імкнуўся да таго, каб гэты дзень адзначыць выдатнымі перамогамі. Тады, у дні сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў, я выконваў сваё заданне на 500 і больш процантаў. Замацаваўшы свае поспехі, у гонар 20-й галавіны ВЧК—АДПУ—НКВД, 22 снежня я разам з тав. Златкіным уручную адштампаваў 48 лапатак да турбіны, выканаўшы норму на 1.333 проц. Гэта быў мой першы рэкорд.

Але на гэтым як я, так і тав. Златкін не спыніліся, а дабіваліся ўсё большай прадукцыйнасці працы. З студзеня, працуючы ў другой змене, за 7 гадзін работы мы адштампавалі на 3 прэсах 72 лапаткі. Гэтым самым выканалі сваё заданне на 1700 процантаў. Наш дзённы заработак склаў 285 рублёў. Як-жа мы дабіліся гэтых поспехаў? Дзіўнага тут нічога няма Галоўнае — гэта ўменне арганізаваць сваю працу і вытворчы працэс. Увесь працэс вытворчасці лапатак заключаецца ў наступным: спачатку мы іх самі выразаем уручную з 6-міліметровага жалеза потым штампуем, пасля наступным працэсам патганяем іх пад шаблон. Свідруем дзіры, робім фазкі — і лапатка гатова.

Перш чым прыступіць да работы, мы падрыхтоўваем штампы, аслабяняем рабочае месца, аглядаем горан, правяраем работу штампаў, як яны ходзяць, бо бываюць выпадкі, калі ад перакосу балтоў верхняя пакрышка штампа можа не падняцца, што выклікае вялікія прастоі. Важна тут яшчэ і тое, каб на папярэднім працэсе — рэзка дэталяў лапатак — не было дапушчана памылак.

У дзень апошняга рэкорда, 3 студзеня, мы працавалі на трох штампах, г. зн. выпускалі лапаткі трох відаў. І тут вялікім тормазам у рабоце было тое, што ў нас на тры штампы меліся толькі два балты, г. зн. два штампы былі без балтоў. Таму ў часе работы прыходзілася перакладваць балты з аднаго штампа ў другі. А працей-жа за ўсё мець на ўсіх штампах асобныя балты, што значна зэканоміла-б час і павялічыла-б нашу прадукцыйнасць. Гэтага якраз адміністрацыя нашага завода не можа зразумець. Закончыўшы работу на двух штампах мы вымушаны былі самі цягнуць трэці штамп, што адабрала ў нас нямала рабочага часу.

Для таго, каб рэкорды не былі адзінкавымі і каб сістэматычна намнога перавыконваць нормы, патрэбна нашым кіраўнікам завода ўмела планаваць працу, забяспечваць нас неабходным матэрыялам, інструментамі, дэталямі. Добра ведаць аб усіх тых перашкодах, якія адбіваюцца на нашай рабоце. Узяць хоць-бы наступны прыклад: на нашай рабоце мы карыстаемся наждачным камнем для зняцця фазак на лапатках. Але гэты камень бывае настолькі дрэнны, што намнога зніжае нашу прадукцыйнасць. Быў такі выпадак на заўтра пасля нашага першага рэкорда, калі па віне механіка Баравіка, мы 23 снежня ўвесь дзень прастаялі толькі з-за таго, што не быў зменен наждак. А для змены наждака патрэбна не больш поўтадзіны.

Наш завод гадавы план 1937 года выканаў на 101,4 проц. Разам з намі добрыя паказальнікі работы давалі і другія стаханаўцы. Вось, напрыклад, токар т. Архімовіч выконваў заданне на 600—700 проц., токар тав. Попель у асобныя дні даваў нават да 750 проц., слесар тав. Рахоўскі — да 600 проц. і інш.

Але такая стаханаўская праца не была яшчэ масавага характару. Бываюць дні, калі нормы не выконваюцца і абталяванне прастойвае. Захапляючыся асобнымі рэкордамі, нашы кіраўнікі забываюць аб асноўнай масе рабочых.

Мы ўступілі ў новы, 1938 год. Задача ўсяго нашага калектыва сваёй большэвіцкай, стаханаўскай работай дабіцца выканання і перавыканання вытворчай праграмы.

А. Р. МАЦ,
стаханавец-слесар бабруйскага завода імя Сталіна.

У УЗДЗЕНСКІМ ЛЕСПРАМГАСЕ НЕ АДБЫЛОСЯ НІЯКІХ ЗМЕН

УЗДА. 5 студзеня. **(Па тэлефону).** У канцы снежня СНК БССР у сваёй пастанове адзначыў злачынную бяздзейнасць Уздзенскага райвыканкома і леспрамгаса ў выкананні плана лесазагатовак і вывазкі. Дырэктару леспрамгаса тав Канашэвічу была абвешчана вымова. Старшыня райвыканкома тав. Катляроў быў папярэджан, што, калі на працягу 5—7 дзён не забяспечыць выкананне плана IV квартала, ён будзе прыцягнут да суровай адказнасці.

Ці зрабіла практычныя вывады з гэтай пастановы кіраўніцтва леспрамгаса і райвыканкома? Факты паказваюць, што такіх вываду яно не зрабіла.

Дабрадушнасць і супэкой па-ранейшаму пануюць у грамоздкім апараце леспрамгаса. План IV квартала па загатоўках выканан на 84 проц., па вывазцы— на 78 проц. Але і гэта дасягнута толькі сіламі калгасаў. Уласным-жа транспартам леспрамгас квартальны план лесавывазкі выканаў толькі на 66,8 проц. З наяўных у леспрамгасе 112 рабочых коней на лесавывазках скарыстоўваецца не больш 50 проц., а астатнія — на другарадных работах. Не адчуваецца сур'ёзнага зруху і ў апошнія дні. У распараджэнне леспрамгаса днямі прыбыў новы аўтатранспарт, але бязрукае кіраўніцтва не знайшло часу пусціць яго ў ход.

Не створаны спрыяючыя ўмовы ў рабоце лесарубаў і возчыкаў, якія выязджаюць на далёкую адлегласць і там расквартыроўваюцца. Былі выпадкі, калі прыехаўшыя возчыкі і лесарубы на Ракашынскі ўчастак з прычыны адсутнасці для іх неабходных умоў былі вымушаны вярнуцца назад.

Паводле пастановы РВК дагаворы з калгасамі па лесазагатоўках і вывазцы на першы квартал павінны былі быць заключаны леспрамгасам да 25 снежня 1937 г. Між тым яны не заключаны яшчэ і сёння. Работнікі леспрамгаса адседжваюцца ў апараце, спадзяючыся, відавочна, што самі старшыні калгасаў прывязуць ім дагаворы ў гатовым выглядзе. З боку-ж некаторых старшынь калгасаў і сельсоветаў у гэтай важнейшай справе праяўляюцца антыдзяржаўныя тэндэнцыі. Напрыклад, старшыня калгаса імя Варашылава тав. Махнач доўга сабатаваў гэту справу, заяўляючы: «без дагавора я нікому нічым не буду абавязан». З 1 студзеня калгасы «Большэвіцкая перамога», імя Будзённага, «Чырвонамайск», Прысынкаўскага сельсовета, зусім не высылаюць у лес ні лесарубаў, ні возчыкаў. На факты ўхілення ад заключэння дагавораў, факты сабатажа лесазагатовак і вывазкі раённае кіраўніцтва не рэагуе.

Я. ІВАШЫН.

МІЖНАРОДНЫ АГЛЯД

21 снежня рэспубліканскія часці занялі Тэруэль. Інтэрвенты і мяцежнікі, якія на ўвесь свет абвяшчалі пра блізкае генеральнае наступленне «нацыянальных» сіл і хуткі разгром рэспубліканцаў, былі раптоўна паралізаваны бліскучай аперацыяй рэспубліканскай арміі, сарваўшай усе планы мяцежнікаў і нанёсшай ім моцны і трапны ўдар. Фашысткі генерал Аранда за некалькі дзён да ўзяцця рэспубліканцамі Тэруэля выхваляўся, што ён мае дастатковую колькасць артылерыі і войск, каб скрышыць любую масу і разграміць ворага. Рэспубліканцы паказалі, што ім не страшны адборныя сілы фашысцкіх галаварэзаў, што армія рэспублікі даволі добра ўмацавалася для таго, каб узяць на сябе вырашэнне самых цяжкіх і складаных ваенных аперацый.

Баі за Тэруэль дэманстравалі ўсяму свету ўзрослую баявую магутнасць рэспубліканскіх войск. І недарма ўзяцце Тэруэля выклікала такі перапалох у лагеры мяцежнікаў.

Нават італьянская фашысткая газета «Стампа» вымушана была прызнаць, што наступленне на Тэруэль па сваёй арганізаванасці і па падрыхтоўцы перавысіла ўсе ранейшыя аперацыі рэспубліканскіх войск.

Інтэрвенты і мяцежнікі перакінулі на арагонскі фронт вялізныя сілы і магутнае ваеннае ўзбраенне, каб вярнуць Тэруэль, каб аднавіць страчаныя пазіцыі. На працягу апошніх дзён мяцежнікі вялі безупынныя лютыя атакі, увялі ў дзеянне магутную ваенную тэхніку і ў гэтых баях панеслі велізарныя страты У рэзультаце шалёных атак угарныя фашысцкія часці былі проста скрышаны і абяскроўлены. Адзіны рэзультат — некалькі квадратных кілометраў адваяванай тэрыторыі — разумеецца, не вырашае пытання. Гульня напэўна не варта свечак.

Чаму мяцежнікі з такой шалёнай рашучасцю, з такім азвярэннем імкнуцца ізноў заняць Тэруэль? Трэба ўлічыць, што гэты ўмацаваны горад мае буйнае стратэгічнае значэнне. На Тэруэль Франко імкнуўся ў свой час абаперціся, каб адрэзаць Каталонію—перв краіны—ад рэспубліканскай тэрыторыі. Тэруэльскі выступ заўсёды з'яўляўся пагрозай для рэспубліканцаў. Наступаючы ад гэтага ўчастка фронта на поўдзень, да ўзбярэжжа, мяцежнікі маглі раскалоць тэрыторыю рэспублікі на дзве часткі і гэтым стварыць вялікую небяспеку для рэспубліканскай Іспаніі. Заняўшы Тэруэль, рэспубліканцы ліквідавалі буйную стратэгічную пагрозу, знішчылі небяспечную для сябе стрэмку. Нельга таксама забываць, што пакуль Тэруэльскі вузел знаходзіўся ў руках Франко, рэспубліканцы павінны былі перакідваць свае сілы з аднаго фронта на другі абходным шляхам праз Валенсію. Заняцце Тэруэля дазваляе скараціць на 4—5 дзён тэрмін перакідвання войск. Гэта акалічнасць мае вельмі важнае ваеннае значэнне. І гэта добра ўлічваюць мяцежнікі. Вось чаму баі на Тэруэльскім ўчастку прынялі надзвычай упарты і люты характар.

***

Крывавыя ўпартыя баі ідуць у Кітаі. Шматпакутны кітайскі народ гераічна супраціўляецца ўзброенаму да зубоў японскаму дрэнежніку, мужна абараняе сваю незалежнасць.

Пачаўшы летам мінулага года наступленне ў Паўночным Кітаі, японская ваенщчына разлічвала на «кароткую» вайну на хуткую перамогу. Прайшло больш шасці месяцаў ад пачатку інцыдэнту на станцыі Люкоуцяо, паслужыўшага поваадам для японскага наступлення. За гэты час японцы занялі вялікую тэрыторыю Кітая, праніклі ўглыб краіны, захапілі сталіцу Кітая—Нанкін, важнейшы прамыслова-фінансавы цэнтр краіны Шанхай, занялі сталіцы раду правінцый — Баодын, Тайюань, Цзінань, Ханчжоу і інш. Тым не менш японцы таксама далёкі ад вырашэння пастаўленых перад сабой задач, як у пачатку вайны. Вайна прыняла зацяжны, доўгі характар, на які японскія кіруючыя колы менш за ўсё разлічвалі.

Наступленне японцаў на фронце Шанхай—Нанкін патрабавала арміі ў 300 тысяч чал. — больш, чым уся японская армія да 1930 г. Гэтым наступленнем японцы імкнуліся злавіць двух зайцаў — канчаткова разграміць кітайскую армію і ўнесці дэмаралізацыю ў рады абаронцаў Кітая. Ні тая, ні другая мэта не дасягнуты — кітайскія войскі ўхіліліся ад разгрому і адступілі ў поўным парадку. Страта цэнтраў краіны не ўнесла панікі ў рады абаронцаў, не пазбавіла Кітай сродкаў зайны. Распе нянавісць і супраціўленне кітайскага народа агрэсару.

Кітайская чырвоная армія, рэарганізаваная ў 8 народна-рэволюцыйную армію Кітая, якая аперуе ў правінцыі Шаньсі і разграміла некалькі японскіх атрадаў, падняла насельніцтва Паўночнага Кітая на ўзброеную барацьбу з агрэсарам. Партызанскі рух набыў велізарныя, пагражаючыя для захватчыкаў размеры. Штодня фармуюцца новыя і новыя атрады, у якія ўступаюць дзесяткі тысяч рабочых, сялян і рамеснікаў.

У снежні мінулага года японскае камандаванне рашуча ўзялася за ачышчэнне Паўночнага Кітая ад партызан, паслала ў найбольш небяспечныя для сябе раёны рад карных атрадаў з авіяцыяй і артылерыяй. Японцы пачалі нават перакідваць пэлыя дывізіі на барацьбу з партызанамі. Аднак апошнія паведамленні гавораць, што японскае камандаванне не дабілася ніякіх істотных поспехаў. Карыстаючыся вылатным веданнем мясцовасці, партызаны наносяць ворагам кароткія, але адчувальныя ўдары.

Японская ваенщчына сур'ёзна застрала ў Кітаі. Фронт распягнуўся на сотні кілометраў. Толькі ў даліне ракі Янцзы фронт падоўжыўся з 40 клм. у кастрычніку да 600 кілометраў у сучасны момант. А гэта прымушае японскае камандаванне трымаць вялікія сілы. Вайна абышлася Японіі ў мільярды іен, больш чым руска-японская вайна. Усё новыя і новыя мільёны выжымае ваенщчына з жабрацкага, галадаючага народа. Фінансы краіны — у крытычным становішчы. А канца вайны не відаць. Аб хуткай перамозе можна толькі марыць. Не дзіўна пасля гэтага, што японскія імперыялісты згадзіліся на прапановы свайго германскага саюзніка аб пасрэдніцтве. Германскі пасол у Кітаі Траутман прапанаваў Чан Кай-шы прыняць японскія мірныя ўмовы. Чан Кай-шы катэгарычна адверг іх.

Кітайскі народ зараз яднаецца на барацьбу з агрэсарам. Створан вярхоўны ваенны совет, на чале з Чан Кай-шы, у які ўвайшлі правадыры Кітайскай компартыі Мао Цзе-дун, Чжу Дэ і Пэн Дэ-хуай. Ствараецца ўсекітайская дзяржаўная ўлада. На барацьбу падымаюцца мільённыя народныя масы. Кожны лішні дзень вайны нясе Японіі новыя непрыемнасці. Разграміць кітайскую армію не ўдалося. А вайна на «змор» смяротнай небяспекай пагражае японскім імперыялістам.

Чым больш накаляецца глеба пад нагамі японскай ваенщчыны, тым больш пахабнымі робяцца яе патрабаванні, тым больш наглым робіцца яе тон. Гэта нахабства нагадвае рашучасць драпежніка, які пэпаў у засаду, якому няма чаго трапіць, якога можа выратаваць толькі шаленства адчаю

Японскі міністр унутраных спраў, вядомы фашысцкі дзеяч і адзін з ідэолагаў найбольш крайніх колаў імперыялістаў — Суэцугу у інтэрв'ю з прадстаўніком японскага журнала з нахабнасцю вісельніка заявіў, што гістарычная місія Японіі—выгнаць белую расу з Далёкага Ўсходу, аб'яднаць Кітай, Манчжоу-Го і Японію ў адно цэлае. Суэцугу кінуў выклік вядучым імперыялістычным краінам. Ён, не саромячыся, раскрыў карты японскай ваенщчыны, паказаў, што хаваецца за разважаннямі аб «выратаванні Кітая ад комуністычнай небяспекі». За шырмай гэтых разважанняў хаваецца адкрытая барацьба супроць імперыялістычных суперникаў Японіі — Англіі, Францыі, ЗША, імкненне падняволіць Кітай, зрабіць яго японскай калоніяй.

Заява Суэцугу — не п'яны брэд зарваўшагася салдафона. Яна саправаджаецца даволі рэальнымі дзеяннямі. Японія ваеннымі дзеяннямі ў Паўднёвым Кітаі стварыла яўную пагрозу Ганконгу — англійскай ваенна-морскай базе ў Паўднёва-Кітайскім моры. Недарма англійскія ўлады ў Ганконгу рыхтуюцца да абароны. Захватчыкі занялі буйны порт у правінцыі Шаньдун — Цындао, дзе сканцэнтраваны інтарэсы раду капіталістычных дзяржаў.

Англія і Францыя не адну горкую пілюлю праглынулі ў Кітаі. Нават страта эканамічных пазіцый і прывілей у Шанхаі не пераміусіла іх адмовіцца ад палітыкі непраціўлення агрэсару. І кожная новая ўступка толькі распальвае апетыты драпежнікаў.

Як піша вядомая французская журналістка Жэнеўева Табуі ў газеце «Эўр», «Японія не ўпэўнена ў сваёй перамозе над Кітаем. Японскія ваенныя лідэры адчуваюць страх перад вынікам кампаніі. І гэты страх можа штурхануць іх на большыя, чым дагэтуль шаленствы».

***

Германскі фашысцкі друк б'е ў барабан: «нашага палку прыбыло». Падрыўная дзейнасць агентаў Гестапо ў Румыніі прынесла свае плады: да ўлады прышоў кабінет Гогі, гітлераўскага прыяцеля; Францыі нанесен новы ўдар.

Як вядома, у рэзультаце апошніх выбараў у румынскі парламент, урад Татарэску прымушан быў пайсці ў адстаўку. Выбарчыкі чакалі, што да ўлады прыйдзе дэмакратычны ўрад. Аднак, наперакор волі народа, кароль даручыў складанне кабінета кіраўніку фашысцкай «нацыянал-хрысціянскай» партыі Гога.

Сусветны друк даў аднадушную ацэнку новаму румынскаму ўраду.

Як пісала французская газета «Эўр», палітычныя ідэі Гога вядомыя, яны заключаюцца ў фашызме гітлераўскага тыпу. У замежнай палітыцы гэтыя ідэі сумяшчаюцца з осю Берлін—Рым. Англійскі ліберальны друк адзначаў, што стварыўшы кабінет Гогі, румынскі кароль вязе небяспечную ігру. Чэхаславацкі друк пісаў, што кабінет Гогі можа радыкальна змяніць унутраную і замежную палітыку краіны і павярнуць яе ў бок, пажаданы агрэсарам. Румынскі амазіцыйны друк падкрэсліваў, што новы ўрад пазбаўлен якой-небудзь апоры ўнутры краіны і карыстаецца выключна падтрыманнем Германіі.

Стварэнне новага румынскага ўрада выклікала сур'ёзны непакой ва ўсіх шчырых прыхільнікаў міру ў Францыі, Чэхаславакіі і ў іншых краінах. Яно з'явілася законным рэзультатам злачыннай палітыкі патурання і дапамогі агрэсарам з боку асноўных капіталістычных краін.

Першыя крокі новага румынскага ўрада апраўдалі самыя песімістычныя чаканні.

Рашэнні ўрада аб нацыяналізацыі друку, аб радзе антысеміцкіх мерапрыемствах і інш. і інтэрв'ю Гога з прадстаўнікамі англійскага друку сведчаць, што кабінет Гогі пераняў «лепшыя традыцыі» Гітлера, што Гога з'яўляецца верным вучнем германскіх фашыстаў. Апошнія паведамленні з Варшавы аб тым, што Румынія стварае новы «антыкомуністычны блок» у складзе Румыніі, Польшчы і Югаславіі і што новы румынскі ўрад імкнецца да збліжэння з фашысцкай Германіяй, яркa гаворыць аб курсе замежнай палітыкі новага кабінета. Урад Гогі вядзе небяспечную ігру. Ён штурхае знясіленую краіну на шлях авантур, на шлях ператварэння яе ў прыдатак, у калонію фашысцкіх дзяржаў.

Гэтая небяспечная ігра дорага можа каштаваць Румыніі.

С. Б.

ФУРНІТУРА

...кільна расце добрабыт працоўных ...краіны. Наш совецкі спажывец ...ляе штораз большыя і большыя ...ванні на культурна, прыгожа аздоб...ечы шырокага спажывання. Пачаў...ўніцтвам у г. Менску ў канцы ...ола фурнітурны завод будзе выраб...еталічную фурнітуру, вельмі неаб...для цэлага раду галін нашай ...повасці, выпускаючых рэчы шыр...ку.

...стымент гэтага завода будзе вель...атым. Тут фурнітура для мэблі ...і для шафаў, скрынь, пісьмовых ... канап), для чамаданаў, партфе...я скургалантарэйных вырэбаў, ...і кручкі для абутковай прамыс...спражкі розныя для мужчын...аночых і жіночых падвязак і рад ...вырабаў. Усе гэтыя рэчы будуць ...ваныя, прыгожа зробленыя, ме...кілявання, храміравання, серабрэн...д.

...рка будзе развіта вытворчасць ...фурнітуры для шкляных вырабаў. ...скі шкляны завод імя Дзержын...вырабляе шкляную пасуду, якая ...талічнай аброблы набывае зусім ...больш багаты і культурны выгляд.

...будаўніцтва прадпрыемства, ра...еабходнымі жыллёвымі будынкамі. ...кладаць суму ў 10 мільёнаў руб...вод будзе мець тры вытворчыя ..., сталовую, адміністратыўны ...і рад дапаможных і падсобных ... Праектам прадугледжаны так...шы, разлязвалкі, цёплыя прыбі...і пакоі для апачынку, Алсут...скучонасці карпусоў (па праек...гуральне (бакавое святло і верхні ...электраасвятленне пры наяўнасці ...прыточна-выцяжной вентыля...вінны стварыць найлепшыя ўмо...цы і высокую прадукцыйнасць яе.

...этага часу на пабудову завода ...на 1.600.000 рублёў. У 1937 ...своена 1.200.000 рублёў. Ужо ...сталовая, 1 вытворчы корпус, ча...клад. Заканчваецца кацельная.

...одна адзначыць, што фінансa...этай будоўлі ідзе вельмі марудна ...кту завод павінен быць пабудава...гады. Аднак Дзяржплан БССР на ...ой адпускае заводу ўсяго 1.000.000 ... Гэта сума нават не забяспеч...нчэння пэхаў першай чаргі. Па...е будаўніцтва да гэтага часу не ...на ні адной капейкі.

...ні днямі адбылася нарада ў Нар...проме, на якой прынята рашэнне ...ць ў кэштарыс будаўніцтва фар...а завода 2 жыллёвыя дамы па ...тэр, пастаянны інтэрнат на 150 ...яслі на 80 дзяцей.

...завезена рад станкоў для пуску ...чаргі завода. Аднак мы яшчэ не ... Наркамата нараду на боль...неабходнага абсталявання (пра...алагражучыя станкі, трансфарма...інш.).

...з будаўніцтвам ідзе падрыхтоў...аў для будучага завода. Аргані...тэхнічны аддзел распрацоўвае ...ы вырабаў, штампаў для прадук...ошай чаргі. Выраб штампаў да ...інструментальнага пэха нала...а на заводзе ланцугоў Галя. ...ова з гэтым тут-жа рыхтуюцца ... Апрача таго, віцебская школа ...ыступіла ў бягучым годзе ла...оўкі кадраў для фурнітурнага за...окараў, слесараў, інструментальш... і нікеліроўшчыкаў).

...ніцтва фурнітурнага завода мае ... народнагаспадарчае значэнне ...ляспром і Дзяржплан БССР па...ддаць больш увагі гэтай будоўлі

Л. ГАРЭЛІК.

Стаханавец-каваль менскага станкабудаўнічага завода імя Варашылава т. Лынко штодня выконвае план на 180—200 проц.
На здымку: тав. Лынко за работай ля электрамолата. Фото Я. Салавейчыка.

НАД ЧЫМ БУДЗЕМ ПРАЦАВАЦЬ У 1938 г.

Я малады совецкі інжынер. Яшчэ толькі чатыры галы таму назад я пакінуў універсітэцкую лаву і пайшоў на самастойную, адказную працу на завод.

Працуючы на заводзе, я, разам з тым, вучуся, з года ў год пашыраю свае веды на практычнай рабоце.

1937 год з'явіўся годам, які прынёс мне вялікую перамогу ў маёй працы. Я рэканструіраваў возавыя вагі грузападъёмнасцю ў 3.000 кілограмаў. Гэта дало заводу рэальнай эканоміі 20.000 рублёў у год і значна палепшыла якасць ваг.

Для ўзбагачэння вопыту нашай работы мяне камандзіравалі ў 1937 годзе ў вытворчую экскурсію ў Маскву, Харкаў, Днепрапетроўск, Кіеў і Одэсу. Гэта вельмі многа дапамагло нам у арганізацыі вытворчасці.

Уступаючы ў новы стаханаўскі год, перада мною, як інжынерам, стаіць рад адказнейшых задач. Заклік таварыша Сталіна, з якім ён звярнуўся да інжынераў, тэхнікаў, гаспаларнікаў яшчэ 2 гады таму назад, на Першай усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў у Крэмлі — узначаліць стаханаўскі рух, з'яўляецца для мяне пуцяводнай зоркай ва ўсёй рабоце, у правільнай арганізацыі вытворчасці.

1938 год будзе для мяне годам вялікай творчай работы. Я буду працаваць над канструкцыяй 10-тонных аўтамабільных бягірных вагаў з новымі чыгуннымі рычагамі. Такія вагі эканомяць многа дэфіцытнага металу.

У планах маёй работы на бягучы год прадугледжваецца таксама падрыхтоўка да выпуску на нашым заводзе цыферблатных настольных вагаў, якія да гэтага часу ўвозіліся з-за граніцы. Гэта будуць больш рацыянальныя і культурныя вагі.

З небывалым энтузіязмам, з вялікім творчым імкненнем я ўступаю ў гэты выдатны год, які нязмерна узбагаціць нашу цудоўную радзіму, праславіць наш геройскі народ новымі подвігамі, новымі гістарычнымі адкрыццямі.

У мне гарыць адзінае, моцнае жаданне — як можна больш, усё што ў маіх сілах зрабіць у імя гэтай любімай радзімы, слаўнай партыі большэвікоў, якою кіруе геній чалавецтва — вялікі Сталін.

Пад шчаслівым сталінскім сонцам адчуваючы штодзённыя клопаты аб чалавеку, аб яго росце, культурным жыцці, хочацца жыць, тварыць, радавацца, ведаючы, што твая праца ідзе на карысць краіны сацыялізма!

БЛЮМКІН,
інжынер завода «Ударнік» (Менск).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ
(ХРОНІКА)

ВЫЛУЧЭННЕ АКТЫВІСТАЎ ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

Бешанковіцкі райком партыі вылучае на адказныя ўчасткі работы актывістаў выбарчай кампаніі. Выдатна праявіўшы сябе ў дні выбараў даверанны зыбарчага ўчастка брыгадзір калгаса «1 мая» комсамолец тав. Новікаў вылучаны старшынёю Бацейкаўскага сельсавета.

Здольным арганізатарам паказаў сябе даверанны кандыдат партыі тав. Прохараў, які зараз вылучан дырэктарам Бешанковіцкай МТС. Добра працавалі старшыні ўчастковых камісій комсамолец тав. Канашелька, кандыдат партыі тав. Цараў, член партыі Каваленка. Яны таксама вылучаны на адказныя работы.

Комуніст тав. Іофе доўгі час лічыўся ў партыйнай арганізацыі пасіўным. У дні выбараў ён паказаў сваю здольнасць, вельмі добра працаваў агітатарам сярод працоўных мас. Тав. Іофе выбран старшынёю культасвета бешанковіцкай арцелі «Чырвоны вацільнік», дзе працуе больш тысячы чалавек.

Сярод новавылучаных ёсць і актывісткі-жанчыны, якія прапавалі агітатарамі, даверанымі, сакратарамі на выбарчых участках. Старшынёю Бешанковіцкага нацыянальнага совета выбрана комсамолка тав. Смаразінская. На пасаду загатчыка аддзела піонераў у райкоме комсамола вылучана тав. Хейфец. Малодая калгасніца Шыёнак Анна вылучана старшынёй калгаса «Герой».

Актывіст выбарчай кампаніі, беспартыйны т. Абуховіч Антон выбран старшынёю калгаса «Чырвоны баец», старшынёй другога калгаса «Чырвоны дазор» выбран калгаснік Янекін Павел. Калгаснік Будзько Фёдар вылучан брыгадзірам калгаса імя Сталіна.

С. БРАЙНІН.

МАСАВЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПАРТКАБІНЕТА

БАБРУЙСК. Пасля сканчэння выбараў партыйная арганізацыя лесакамбіната замацоўвае дасягнутыя поспехі ў разгортванні агітацыйнай работы сярод працоўных. Нашы агітатары працуюць на сваім участку. Партыйны кабінет аказвае вялікую дапамогу агітатарам у іх практычнай рабоце.

У парткабінеце праведзена нарада парторгаў сумесна з агітатарамі і прапагандыстамі, на якой абмяркоўваліся вынікі партыйнай вучобы ў 1937 годзе і выпрацоўваліся мерапрыемствы на 1938 год.

Партком сумесна з парткабінетам распрацаваў мерапрыемствы па правядзенню ў студзені месяцы 10-дзённых курсаў агітатараў. Зараз праходзяць курсы профактыва. На іх займаецца каля 60 чалавек.

Парткабінет перад кожнымі заняткамі гуртка на выбарчым участку праводзіць семінар агітатараў, забяспечваючы іх неабходнай літаратурай, выразкамі асобных артыкулаў з газет, мастацкімі кнігамі і іншымі неабходнымі дапаможнікамі.

НОВІКАВА.

55 АГІТАТАРАЎ ПРАЦУЮЦЬ НА ВЫБАРЧЫМ УЧАСТКУ

МАГІЛЕЎ. Выбары вырасцілі ў партыйнай арганізацыі магілеўскай шоўкавай фабрыкі дзесяткі актыўных агітатараў. Яны замацаваны на выбарчым участку для штодзённай палітычнай работы з працоўнымі масамі.

Партком 2 студзеня склікаў семінар агітатараў, на якім распрацаваў канкрэтныя мерапрыемствы работы ў кожным гуртку. Зараз агітатары глыбока вывучаюць прамову таварыша Сталіна на перадвыбарчым сходзе Сталінскага раёна горада Масквы. Чарговыя заняткі будуць прысвечаны вывучэнню Канстытуцыі Беларускай ССР.

Агітатары арганізуюць сходы працоўных. 4 студзеня праведзен сход з дакладам на тэму «Контррэволюцыйная сутнасць рэлігіі». Прысутныя ўважліва слухалі даклад і выказвалі жаданне часцей праводзіць з імі такія гутаркі.

На ўчастку ў нас працуе 55 агітатараў, з якіх 12 беспартыйных. Агітатары тт. Собалева, Мнухін (беспартыйны рабочы) і іншыя праяўляюць вялікую актыўнасць у разгортванні палітычнай агітацыі.

КАГАНСКІ.

АКТЫВІСТЫ ЎСТУПАЮЦЬ У ПАРТЫЮ

БАРЫСАЎ. Пярвічная партыйная арганізацыя запалкавай фабрыкі імя Кірава разгарнула работу па ўцягненню ў рады лепшых людзей, якія выдатна працавалі агітатарамі, прапагандыстамі, даверанымі асобамі, членамі зыбарчых камісій у дні падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

Агітатар, майстар змены планачнага пэха тав. Стралкоўскі пераведзен партыйнай арганізацыяй з кандыдатаў у члены партыі, комсамолец тав. Дрыц прынят у кандыдаты партыі. Падалі заявы ў партком аб уступленні ў кандыдаты партыі лепшыя комсамольцы Гвяздовіч, Пракапові ч і стаханавец-манцёр тав. Мускін.

Растуць рады груп спачуваючых. У парткоме ёсць некалькі заяў ад рабочых і работніц, жадаючых уступіць у спачуваючыя. Рад тазарышоў спачуваючых, якія значна выраслі палітычна (Каждан, Шустэрман і інш.), рыхтуюцца да пераводу ў кандыдаты партыі.

БЛІНКОЎ.

ЧЛЕНЫ АКРУГОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ ПРЫНЯТЫ Ў ПАРТЫЮ

АСІПОВІЧЫ. Райком партыі прыняў у кандыдаты партыі актывістаў выбарчай кампаніі—члена акруговай камісіі па выбарах у Совет Саюза, настаўніцу тав. Сучок Е. П. і члена акруговай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей, комсамолку тав. Бяляеву М. Таксама прынят у кандыдаты партыі старшыня ўчастковай выбарчай камісіі тав. Астрэйка і ў спачуваючыя—былы даверанны, старшыня калгаса «Рэкорд» тав. Ермаліцкі. Усяго за апошнія дні прынята ў кандыдаты партыі 10 чалавек і 3 чалавекі пераведзены з кандыдатаў у члены.

Сесіі настаўнікаў-завочнікаў

Пры ўсіх педагагічных інстытутах і вучылішчах БССР пачаліся зімовыя вучэбна-заліковыя сесіі настаўнікаў, якія не маюць закончанай педагагічнай асветы і атрымліваюць гэту асвету завочна, без адрыву ад работы. На сесіі выклікаюцца з раёнаў рэспублікі 17.500 настаўнікаў.

Апрача таго каля 100 настаўнікаў-завочнікаў у бягучую заліковую сесію заканчваюць Белдзяржуніверсітэт і педагагічныя інстытуты Менска, Магілева, Гомеля і Віцебска. Гэтыя настаўнікі да 15 лютага будуць здаваць дзяржаўныя экзамены і атрымаюць вышэйшую педагагічную асвету.

У 1938 годзе на завочную вучобу настаўнікаў намечана выдаткаваць звыш 6 млн. рублёў.

ТВОРЧАЯ КАМАНДЗІРОЎКА МАСТАКОЎ БССР

5 студзеня група мастакоў і скульптараў БССР у колькасці 17 чалавек выехала ў творчую камандзіроўку ў Кіеў і Маскву. Мастакі наведаюць у Кіеве выстаўку «Квітнеючая Украіна» і ў Маскве — рад мастацкіх выставак і карцінных галярэй.

У гарадскім парку імя Горкага.
Фото С. Грыма.

У ПАЛАЦЫ ПІОНЕРАЎ

Весела і цікава праводзяць свой адпачынак вучні і піонеры горада Менска ў Палацы піонераў.

Ад самай раніцы да позняга вечара Палац напоўнен дзецьмі, у якіх цяпер цэлы дзень сзаболны. Адміністрацыя Палаца вызначыла строгі план абслугоўвання школьнікаў.

У першую чаргу была арганізавана новагодняя ёлка. Каля яе піонераў забаўляліі вясёлыя зацейнікі, музыканты, спрытныя танцоры, масавікі і дзед-Мароз.

Шырока разгорнута мастацкая самадзейнасць дзетвары. Хоры піонераў і акцябрат, гурток танцаў, струнны гурток выступаюць штодзённа на сцэне Палаца. Усяго ўдзельнічае ў артыстычным абслугоўванні рэбят каля 900 членаў гурткоў самадзейнасці Палаца.

Палац піонераў арганізаваў 3 студзеня сустрэчу дзяцей з пісьменнікамі. Яны доўга гулялі вакол ёлкі разам з дзетворой, а пасля зачыталі свае новыя творы.

4 студзеня адбылася сустрэча з чырвонаармейцамі. Сустрэча закончылася вельмі цікавым канцэртам чырвонаармейскай самадзейнасці. 6 снежня ў Палац прыдуць беларускія кампазітары, якія раскажуць піонерам аб сваіх творчых планах і выканаюць творы, прысвечаныя совецкім дзецям.

З 5 студзеня пачалася серыя канцэртаў мастацкай самадзейнасці вучняў горадаў Менска. У глядзельнай зале адбываюцца таксама кіносеансы. Дзецям паказваюць лепшыя мультыплікацыйныя фільмы, а таксама любімыя дзіцячыя фільмы.

Вучні 8, 9 і 10 класаў прыдуць у Палац 8 снежня ў рознастайных маскарадных касцюмах на касцюміраваны бал. У апошні дзень канікул у Палац запрашаецца каманды састаў Менскага гарнізона з дзецьмі. Вечарам у зале збярэцца бацькі пічаслівай дзетвары на дзіцячы спектакль.

Палац мае свой каток, на якім дні і вечарам каталоцца піонеры. Гурткі Палаца выкарыстоўваюць зімовы адпачынак для калектыўных вылазак на лыжах за горад, на канках, робяць экскурсіі. Усяго Палац абслужыць за час зімовага адпачынку 10.000 дзяцей.

В. ВАСЮКЕВІЧ.

НЕПАВАРОТЛІВАСЦЬ

Вышэйшыя навучальныя ўстановы ўступілі ў самы адказны перыяд сваёй работы: пачалася зімовая заліковая сесія.

Для паспяховага праходжэння залікаў патрабуюцца, перш за ўсё, чоткая арганізацыя іх, дакладны і непахісны расклад залікаў. Неабходна, каб студэнт загадзя, яшчэ ў пачатку семестра, ведаў, якія залікі і ў які час патрэбна здаваць, для таго, каб правільна распланаваць свой час у рабоце над рознымі прадметамі і тэмамі.

Амаль на ўсіх факультэтах Дзяржаўнага універсітэта (г. Менск) студэнты на працягу ўсяго семестра не зедалі дакладна, якія прадметы яны будуць здаваць у надыходзячую заліковую сесію. Вывешаныя з вялікім спазненнем расклады залікаў па некалькі разоў мяняліся і пераробліяліся. Колькасць падлягаючых здачы прадметаў павялічвалася і зменшвалася. На трэцім курсе гістарычнага факультэта ў план залікаў былі ўключаны 4 прадметы. У канцы снежня залік па новай гісторыі перанеслі на другую палову навучальнага года. Чытанне лекцый і цяпер не закончана. Можна было, безумоўна, і раней прадугледзець гэта і не дазарганізоўваць студэнтаў. На трэцім курсе геаграфічнага факультэта перанесены на другое паўгоддзе два прадметы.

На фізіка-матэматычным факультэце былы дэкан факультэта Гельфанд наогул пераблытаў усе залікі; у план залікаў ён уключыў прадметы, па якіх зусім не трэба праводзіць залікі (факультатыўныя курсы) і самавольна адмяніў залікі, якія падлягаюць абавязковай здачы.

Рэктар універсітэта тав. Андрушчанка не прымае рашучых мер для выпраўлення ўсіх недахопаў у арганізацыі навучання, для ліквідацыі вынікаў шкодніцкай работы зорагаў народа, якія доўгі час арудавалі ва універсітэце і Наркамасветы.

Мяжовежая непаваротлівасць нозага кіраўніцтва ў БДУ асабліва ярка праявілася ў забеспячэнні студэнтаў праграмамі. Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) абавязвае кіраўнікоў ВНУ прадаставіць кожнаму студэнту магчымасць карыстацца праграмай па чытаемаму курсу. Студэнт павінен ведаць дакладна аб'ём патрабуемых ад яго ведаў, мінімум і максімум вучэбнай і дапаможнай літаратуры. Навучальная частка БДУ і дэканы факультэтаў не забяспечылі студэнтаў праграмамі. Па многіх прадметах лекцыі чытаюцца наогул без праграм. Па гісторыі Беларусі, напрыклад, праграма была складзена толькі пасля таго, як чытанне лекцый было скончана. Па вялікаму і важнаму курсу — новай гісторыі—на 70 студэнтаў выдалі тры экземпляры праграмы. Такое-ж становішча на ўсіх факультэтах і па ўсіх прадметах.

Не лепшае становішча з забеспячэннем студэнтаў дапаможнымі табліцамі, схемамі і картамі

Усё гэта трэба неадкладна выпрацаваць.

Якасць выкладання па многіх прадметах за універсітэце нізкая. Ёсць недавыкананне вучэбнага плана.

На гістарычным факультэце самы адказны курс — гісторыя народаў СССР у XX стагоддзі—даручана выкладаць непадрыхтаванаму для чытання лекцый за універсітэце Лочмелю. Ён не імкнецца і не можа прыхаднесці багаты падсеямі час у жыцці нашай радзімы поўна, жыва, цікава. Атрымліваецца нудная схема, а не лекцыя пра жывую, хвалюючую гісторыю нашага народа.

На пытаннях заявы студэнтаў дэкан факультэта тав. П'янкоў і рэктарат адказваюць доўгім і ўпартым маўчаннем. Неабходных мер для забеспячэння ўніверсітэта высокакваліфікаванымі кадрамі выкладчыкаў не прымаецца.

Партыя і ўрад стварылі ўсе неабходныя ўмовы для выдатнай вучобы. Гэта абавязвае выдатна вучыцца і выдатна вучыць. Таму зусім нецярпіма цяперашняе становішча за універсітэце.

Ф. КАНСТАНЦІНАЎ.

Ал. СУРКОЎ

Вялікі рускі паэт-дэмакрат

...дзеня 1938 года споўніцца 60 год ...мерці аднаго з найвялікшых рускіх ... песняра гневу і помсты народ...кілая Алексеевіча Некрасава.

...од, аддзяляючыя нас ад даты ...паэта, не зацямнілі яго светлага ... З года ў год расла і шырылася ...я любоў да таго, хто ўвесь жар ...сэрца, увесь свой велізарны талент ...барацьбе за вызваленне народа, ...акінуў патомству незабываемыя ...карціны народнага жыцця, хто, ...першыню ў гісторыі рускай паэзіі, ...працоўнага чалавека—селяніна, га..., гаротніка-бедняка — галоўным ...сваёй паэзіі.

...і і складаны жыццёвы і літаратур...х прайшоў першы рускі паэт-...т. Выхадзец з асяроддзя дробна...га служылага дваранства, ён з ...ва запомніў жудасныя карціны ...кага рабства, жабрацтва, бяспраўя ...ва і ізікага свавольства памешчы...цька Некрасава, уладальнік сяла ...ва пад Яраслаўлем, чалавек грубы, ...жорсткі, біч сям'і і тыран прыгон...асабляў у сябе ўсе агідныя стора...вячага памешчыцкага класа.

...вісць да бацькі і глыбокую засму...любоў да рана памёршай маці захо...екрасаў на ўсё жыццё. І калі ...ы аб бацьку, аб карцінах грэшнеў...ыцця заўсёды нараджалі ў твор...аэта новыя прылівы нянавісці да ...ніцтва, то ўспаміны аб маці прыхо...сеяныя смуткам.

...мыя цяжкія мінуты свайго жыцця ...клікаў у сваім уяўленні вобраз ...цы-маці. Ён ёй давяраў свае ...та цяготы жыцця, у яе вобразе ён ...сілы для новай барацьбы, веру ў ... раз назаўсёды выбранага шляху:

...ликующих, праздно болтающих,
...грающих руки в крови,
Уведи меня в стан погибающих
За великое дело любви».

Бацька Некрасава ўпарта хацеў аддаць сына на ваенную службу, а будучы паэт страсна імкнуўся да сапраўднай адукацыі ...а сапраўднага, усебаковага развіцця. На перакор угаворам і пагрозам бацькі, Некрасаў па прыезлзе ў Пецербург ідзе не ў юнкерскае вучылішча, а вольным слухачом ва ўніверсітэт. Паэбаўлены бацькаўскага падтрымання, ён пераносіў цяжкае жыццё інтэлігентнага пролетарыя-разначынца, здабываючы харчаванне грашовымі лекцыямі, перапіскай, карэктурай.

Да пятгасцяў незабяспечанага існавання далучылася яшчэ няўдача ў літаратурнай справе. У 1840 годзе Некрасаў выдаў зборнік вершаў «Мечты и звуки», холадна сустрэты крытыкай і атрымаўшы справядліва знішчаючую ацэнку Белінскага.

І толькі пасля таго, як абставіны жыцця звялі Н. А. Некрасава з вялікім рускім крытыкам В. Г. Белінскім, ён становіцца вялікім паэтам, песняром рэволюцыйнай дэмакратыі.

Белінскі, які так рэзка асудзіў зборнік «Мечты и звуки» за іх безжыццёвасць і пераймальнасць, у першых-жа вершах Некрасава, рысаваўных карціны народнага жыцця, беспамылкова, з геніяльнай празорлівасцю вызначыў напрамак яго таленту і акрыліў гэты выдатны талент вялікай мэтай—служэння народу.

Праз некалькі год пасля смерці вялікага крытыка Некрасаў, выдаючы журнал «Современник», сустракаецца з Чарнышэўскім і Дабралюбавым, прадаўжаўшымі справу, пачатую Белінскім. Пад магутным уплывам гэтых рэволюцыянераў-дэмакратаў з яшчэ большай чоткасцю адкрышталёўваюцца ў творчасці Некрасава рэволюцыйна-дэмакратычныя тэндэнцыі.

І хаця Некрасаў фармаваўся як паэт-дэмакрат-рэволюцыянер, праходзячы складны шлях унутраных супярэчнасцей і хістанняў, хаця часамі яго ліра «звук неверный исторгала», у галоўным ён да канца свайго жыцця астаўся верным ідэалам сваіх вялікіх сяброў. Пры жыцці паэта яго вершамі зачытвалася маладое пакаленне Расіі, чэрпаючы ў іх волю да барацьбы.

За 32 гады, аддзяляючыя першы высокамастацкі верш Некрасава «В дороге» ад верша «О Муза! я у двери гроба», напісанага за некалькі дзён перад смерцю, Некрасаў стварыў мноства вершаў, песень і паэм, увасобіўшых у сабе вобразы рускіх людзей і карціны народнага жыцця.

Калі В. Г. Белінскі ў свой час назваў «Еўгенія Онегіна» Пушкіна «энцыклапедыяй рускага жыцця», то з такім-жа правам мы можам назваць «Кому на Руси жить хорошо» Некрасава, роўна як і іншыя яго паэмы і вершы, энцыклапедыяй рускага жыцця 50—70-х гадоў мінулага стагоддзя.

Творы Некрасава прадстаюць перад намі, як велізарная галярэя сатырычных, палка-гераічных і глыбока-трагічных вобразаў рускіх людзей складанай і супярэчлівай эпохі ды і пасля так называемага «вызвалення сялян».

Дзейнасць Некрасава працякала ў тую пару рускай гісторыі, калі пад напорам растучага капіталізма трашчаў і распаўзаўся па швах памешчыцка-прыгонніцкі лад, калі «чумазы» расійскі капіталізм праштурхоўваўся на авансцэну гісторыі, калі перапаўнялася чаша народнага цярпення. Адчуванне перадраволюцыйнага ўздыму Некрасаў выказаў у выдатных радках:

«Душно! Без счастья и воли
Ночь бесконечно длинна.
Буря-бы грянула, что-ли?
Чаша с ядами полна!
Грянь над пучиною моря,
В поле, в лесу засвищи,
Чашу вселенского горя
Всю расплещи!..»

У гэтай перадраволюцыйнай атмасферы вострых зрок паэта адрозніў страшныя лікі «сильных мира сего» — памешчыкаў-прыгоннікаў, тупых бюракратаў з парскай адміністрацыі, грабежнікаў і хабарнікаў, драпежных «шуйца-іванаўскіх гусей», расійскіх прадпрыемцаў-фабрыкантаў. Сатырычнымі вершамі, поўнымі знішчаючай іроніі і гневу, Некрасаў бічуе прыгнятальнікаў народа, кровепіўцаў і тунеядцаў; паэт упершыню ў рускай паэзіі стварае жанр сатырыка-публіцыстычнага верша. У паэме-аглядзе «Современники», у вершах «О погоде», у «Песнях о свободном слове», у сатыры «Балет» і многіх іншых творах паэт кляймію ворагаў роднага народа, яго прыгнятальнікаў. Сатыра пранізвае ўсю творчасць Некрасава, дасягаючы небывалай выкрываючай сілы ў такіх глазах «Кому на Руси жить хорошо», як «Помещик», «Последыш».

З той-жа сілай сарказму і нянавісці абрушваецца Некрасаў і на самую подлую катэгорыю людзей сучаснага яму грамадства — на «ликующих, праздно болтающих» лібералаў расійскіх. Паэт бязлітасна і трапна ўскрываў лакейскую сутнасць лібералаў.

Якім гнеўным і бязлітасным быў голас паэта ў вершах, звернутых супроць прыгнятальнікаў народа і іх лакеяў, такім-жа мяккім і поўным глыбокай любві і веры ў будучае робіцца ён, калі паэт гаворыць аб народзе.

Да выдатнай злітнасці сваёй песні з жыццём роднага народа імкнуўся паэт. Бачачы цяжкае становішча народа, ён смела ўпадабляў сваю музу сялянцы, пакутуючай пад бізунамі на базарным пляцу:

«Вечерний день, часу в шестом,
Зашел я на Сенную;
Там били женщину кнутом,
Крестьянку молодую.
Ни звука из ее груди,
Лишь бич свистал, играя...
И Музе я сказал: «гляди!
Сестра твоя родная!»

Паэт-рэаліст, Некрасаў бачыў страшнае жыццё сялянства і гарадской беднаты, бачыў усю цэру невуцтва, зневажання і рабства, якія скоўвалі творчыя сілы народа. Але паэт глыбока верыў у прыгожую будучыню сваёй радзімы, у вялікія творчыя сілы, якія тоіцца ў сынах народа.

Аб вялікіх сябрах, увасобіўшых у сабе лепшыя рысы рускага народа і рускага таленту, — аб Белінскім, Чарнышэўскім і Дабралюбаву — Некрасаў напісаў вершы найвялікшай паэтычнай сілы, поўныя гордасці за родны народ і смутку аб яго заўчасна загубленых сынах.

Некрасаў клікаў рускую моладзь следаваць прыкладу выдатных людзей. Ён верыў у сілы моладзі, ён зерыў, што сіла народная і розум народны перамогуць.

Звяртаючыся ў «Песне Еремушке» да сялянскіх дзяцей, Некрасаў дае ім завет хаваць:

«Необузданную, дикую
К угнетателям вражду
И доверенность великую
К бескорыстному труду».

Іменна гэтай глыбокай верай у прыгожую будучыню народа можна толькі і растлумачыць тыя светлыя, поўныя шчырай любві вершы, якія прысвяціў Некрасаў дзецям і ў асаблівасці дзецям сялянскім.

Незабыўна прыгожы вобраз селяніна Якіма Нагога з паэмы «Кому на Руси жить хорошо».

І сімвалам селяніна — вялікага ў працы і сакрушаючага ў гневе — узвышаецца вобраз «Сазелия, богатыря святорусского». Адказваючы навестцы, з усведамленнем уласнага дастоінства Савелій гаворыць:

«Ты думаешь, Матренушка,
Мужик — не богатырь?
И жизнь его не ратная,
И смерть ему не писана
В бою — а богатырь!
. . . . . .
И гнется, да не ломится,
Не помится, не валится.
Ужли не богатырь?»

З той-жа сілай рэалістычнага выяўлення малюе Некрасаў і вобразы рускіх жанчын. У «Декабристках» перад намі прадстаюць зобразы сільных, гераічных жанчын, здольных на подвіг і самаадрачэнне. У сялянскіх вершах і паэмах Некрасава ва ўвесь рост устае вобраз рускай жанчыны, сялянскай маці, нясучай цяжар патроенага рабства:

«Три тяжкие доли имела судьба,
И первая доля: с рабом повенчаться,
Вторая — быть матерью сына раба,
А третья—до гроба рабу покоряться,
И все эти грозные доли легли
На женщину русской земли».

Але пад гэтым трайным цяжарам руская жанчына не зламілася. Вось паўстае незабыўны вобраз Арыны — маці салдацкай, зялікай духам сялянскай маці, непахіснай у бядзе. Вось выдатны вобраз Дар'і. Аб іх паэт сказаў:

«Есть женщины в русских селеньях
С спокойною важностью лиц,
С красивою силой в движеньях,
С походкой, со взглядом цариц, —
Их разве слепой не заметит,
А зрячий о них говорит:
«Пройдет — словно солнце осветит!
«Посмотрит — рублем подарит!».

Вялікая заслуга Некрасава перад родным народам у тым, што ён у пераломную пару рускай гісторыі, вострым зрокам мастака-рэаліста і чулым сэрцам рэволюцыйнага дэмакрата ўбачыў і адчуў вялікую сілу народа, як-бы прадсказаўшы тым яго прыгожую будучыню. Гімнам гэтай будучыні гучаць словы яго песні «Русь»:

«Встали — небужены,
Вышли — непрошены:
Жита по зернышку
Горы наношены!
Рать подымается
Неисчислимая!
Сила в ней скажется
Несокрушимая!».

Каму, як не нам, удзельнікам вялікіх спраў, тварцам светлай справы сацыялізма, зрабіўшым убогую і жабрацкую Расію вялікім і шчаслівым Саюзам Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік, глыбей і паўней зразумець гэтыя выдатныя радкі! Патомкі Савеліяў, багатыроў святарускіх, Якімаў Нагіх, патомкі грабароў-беларусаў, склаўшых свае косці ў гіблых расійскіх балотах, мы ў дні шасцідзесяцігоддзя з дня смерці зялікага народнага паэта з радасцю і гордасцю можам сказаць вялікаму рускаму паэту: — Збылася твая мара! Магутнай і багатай стала зямля наша пад вялікім сцягам Леніна—Сталіна.

АБ ТРАМВАЙНЫМ РУХУ У МЕНСКУ

Трамвайная астаноўка. Натоўп людзей. Здалёку паказаўся трамвай. Не пасшеў ён спыніцца, як пачаліся «пасадка»: на поўным хаду пасажыры хапаюцца за ручкі і ўскакваюць у вагон. Навокал—шум, штурхатня.

— Грамадзяне пасажыры, праходзьце ўперад. На пачножках людзі вісяць, білеты потым возьмеце, — завучаным тонам гаворыць кандуктар.

У вагоне пачуліся вымрыкі:

— Ды вяма куды ісці, тут і так ціснулі, што дыхаць цяжка.

— Асцярожна! Не зацісніце дзіцяці!

— Дзе мой галош? Галош згубіўся.

— Ну і штурхатня — усе гузікі паадрывалі.

Даехаўшы да сваёй трамвайнай астаноўкі, многія пасажыры свабодна ўздыхаюць: «Нарэшце прыехалі».

Такі малюнак можна наглядаць штодзённа ў менскім трамваі. Многія, каб не спазніцца на работу, вымушаны ісці пехатою. Другія, прачакаўшы ля трамвайных астановак па 30—40 мінут у марозныя дні, пачынаюць нерваваціца, абураюцца, што трамваі ідуць гуськом толькі ў адзін бок, і, нарэшце, накіроўваюцца пехатою, кожны па свайму маршруту.

Агідная работа менскага трамвая б'е па жыццёвых інтарэсах працоўных, б'е па інтарэсах вытворчасці. Гэта выклікае справядлівае абурэнне і нараканне працоўных.

Нельга сказаць, каб трамвайны парк не быў аснашчоны вагонамі. Вагонаў нямала. Няма недахвату і ў кадрах. Штаты парка запоўнены. А вось большэвіцкай работы не відаць. Тут многа гавораць, выносяць рэзалюцыі, пастановы аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, а назаўтра ўсё забываюць.

Пераражальна-планавы рамонт злачынна зрываецца. У рэзультаце 85 проц. вагонаў патрабуюць капітальнага рамонту.

Шляхавая гаспадарка, дзе шкоднікі асабліва прыклалі сваю брудную лапу, — і на сёння знаходзіцца ў выключна дрэнным становішчы. Старыя, зношаныя рэйкі не заменьваюцца новымі. На радзе паваротаў адсутнічаюць пягі, траверзы, рэйкавыя паклакі. За 11 месяцаў у парку было 16 буйных аварый і 219 выпадкаў вымушанага вялікага прастою вагонаў.

Усё гэта дазарганізуе трамвайны рух. Аварыя аднаго вагона спыняе рух астатніх, тармозіць перасоўванне дзесяткаў тысяч пасажыраў па гораду.

Кіраўніцтва трамвая нават нездольна забяспечыць рэгулярную ачыстку ліній ад снегу, ільду, хуткую электразварку лопнуўшых рэек і паставіць светасігналы на скрыжаваннях вуліц.

Шкодніцтва ў рамонце вагонаў працяваецца і зараз. Ёсць намаль выпадкаў, калі вышаўшы з рамонту вагон праз гадзіну зыходзіць з руху. У сярэднім на лініі знаходзіцца толькі 50 проц. наяўных вагонаў.

6 снежня, напрыклад, з-за шкодніцкага рамонту вагон № 14 зышоў з рэек і затрымаў рух. 10 снежня вагон № 38 сышоў з рэек і ўрэзаўся ў снег. Па такой-жа прычыне 11 снежня зышоў з рэек вагон № 14.

Падобных фактаў можна было-б прывесці больш, але і гэтыя сведчаць, што ў парку дзейнічае чыясьці варожая рука.

Ворагі народа, якія арудавалі ў горсавеце і Наркамаце комунальнай гаспадаркі БССР, на працягу ряду год вялі сваю шкодніцкую падрыўную работу па развалу трамвайнага парка. Былы дырэктар парка Веліцкі, сын ганьляра, на працягу двух год выконваў дырэктывы ворагаў, развальваў трамвайную гаспадарку. Веліцкага знялі з працы, выключылі з партыі, але на яго месца вораг народа, арудваўшы ў Варашылаўскім райкоме КП(б)Б, паставіў Гараўцова, чалавека, які не ўнушае палітычнага давер'я. Намеснікам дырэктара — тэхнарукам парка працуе Ваганец — наследыш Веліцкага. Шкодніцкія справы па развалу трамвайнага парка, праводзіліся гэтым Ваганцом на працягу доўгага часу. Калі да гэтага дадаць, што Ваганец у 1922 годзе імкнуўся ўцячы ў фашысцкую Польшчу, зле быў затрыман нашымі пагранічнікамі, то стане зразумелым, што ўсе так называемыя «тэхнічныя непаладкі» ў парку ёсць замаскаванае шкодніцтва.

Інструктарам службы руху працуе сын буйнага кулака Бярысаў. Гэта імена пад яго кіраўніцтвам ствараецца блытаніна ў трамвайным руху, якая выклікае абурэнне і незадаваленне тысяч пасажыраў.

Аварыі самі па сабе не бываюць. Вагоны самі па сабе з рэек не зыходзяць. Усё гэта рэзультат шкодніцкай работы акапаўшыхся ў трамвайным парку ворагаў.

Пара, даўно пара ачысціць кіраўніцтва трамвайнага парка ад ворагаў і іх прыхвасняў, навесці большэвіцкі парадак, каб працоўныя сталіцы ордэнаноснай БССР, якія толькі пры совецкай уладзе атрымалі трамвай, мелі магчымасць бесперашкодна ім карыстацца.

Г. БАРЫСОВІЧ.
В. АСТРОЎСКІ.

Скульптура таварыша Сталіна

Беларускі скульптар тав. Бразер працуе над скульптурнай фігурай любімага правадыра народаў таварыша Сталіна, для «Всекохудожника» (Масква). Эскіз ужо зроблен. Цяпер ім робіцца другі эскіз.

Адначасова скульптар працуе над двухметровым бюстам таварыша Сталіна для ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, якая адкрываецца ў Маскве ў гэтым годзе.

НАСУСТРАЧ 20-й ГАДАВІНЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ

Набліжаецца XX гадавіна РСЧА — юбілей слаўнай гераічнай Чырвонай Арміі. Байцы, камандзіры, палітработнікі і сем'і начскладa рыхтуюцца дастойна сустрэць гэта вялікае свята. Шырыцца сацыялістычнае спаборніцтва ў баявой вучобе часцей і злучэнняў.

Побач з баявой падрыхтоўкай узмоцнена рыхтуецца да слаўнага юбілея і чырвонаармейская мастацкая самадзейнасць ВВА і гарнізонаў БССР. Дзесяткі калектываў, сотні салістаў—байцоў, камандзіраў, спалучаючы баявую службу з грамадскай работай, рыхтуюць свае праграмы, каб у дні юбілея паказаць сваю чырвонаармейскую мастацкую творчасць. Ужо ідзе адбор лепшых калектываў, выканаўцаў, лепшых вакальных, плясавых, запейніцкіх нумароў. У кожнай часці рэпертуар самадзейнасці прысвечан песням, казкам, частушкам аб вялікім Сталіну, жалезным наркоме Варашылаву, магутнай радзіме, гераічнай Чырвонай Арміі.

Маладое папаўненне 1937 года ўліло ў самадзейнасць Чырвонай Арміі новыя сілы, здольнейшых, культурных маладых грамадзян, з першых-жа дзён уключыўшыхся ў актыўную мастацка-самадзейную работу.

Выраслі і ўмацаваліся калектывы чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці: аркестр гарманістаў кавалерыйскай часці ў складзе 150 музыкантаў, жаночы вакальны ансамбль Н-скай часці, ансамбль баявой частушкі і пляскі часці ваенкома тав. Рыжак, плясавы калектыў Н-скай кавалерыйскай часці, калектыў беларускай песні і пляскі менскага ваеннага вучылішча.

Вялікі інтарэс прадстаўляе данскі казачы хор. У рэпертуары яго — казачая дума аб родным Сталіну, масавыя песні слаўнага совецкага казацтва.

Дзесяткі хораў, аркестраў, ансамбляў рыхтуюцца абслужыць байцоў Чырвонай Арміі ў дні дваццацігоддзя РСЧА. Ствараюцца эстрадныя чырвонаармейскія калектывы, акрабатычныя групы, плясавыя ансамблі. Менскі ДЧА праводзіць конкурс на лепшую чытку мастацкіх твораў аб Чырвонай Арміі. Праводзіцца конкурс на лепшую пізаву самадзейнасць падраздзяленняў.

Самыя выдатныя калектывы і салісты будуць вылучаны для ўдзелу ў гарнізонных і акруговых канцэртах чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці.

ГЛІКАЎ.

«Саврасушка, трогай, Натягивай крепче гужи!
Служил ты хозяину много, В последний разок послужи!»

8 студзеня спаўняецца 60 год з дня смерці вялікага рускага паэта Нікалая Алексеевіча Некрасава, аўтара выдатнейшых вершаў і паэм, адлюстраваўшых цяжкую долю, бяспраўе і пакуты рускага дарэвалюцыйнага сялянства. НА ЗДЫМКУ: ілюстрацыя да паэмы Н. А. Некрасава «Мороз красный нос» — «Пахаванне селяніна». (Малюнак мастака Перова — 1865 г.):

ДА 60-годдзя З ДНЯ СМЕРЦІ Н. А. НЕКРАСАВА

ПА НЕКРАСАЎСКІХ МЕСЦАХ

ГРЭШНЕВА

У родавым маёнтку свайго бацькі — Грэшнёве, Яраслаўскай губерні, правёў дзіцячыя гады вялікі рускі паэт Н. А. Некрасаў. Пейзаж Грэшнёва апісан ім у вершы «Уныние». Пазней, жывучы ў сталіцы, Некрасаў часта наведваў «гняздо» бацькоў. Палкі паляўнічы, ён цэлыя дні брадзіў са стрэльбай у ваколіцах Грэшнёва. Паэт абышоў усе блізкаляжачыя вёскі, назіраючы бядарадзнае і цяжкае сялянскае жыццё.

Зараз у Грэшнёве — калгас імя Некрасава. Ад некрасаўскай сядзібы асталося толькі некалькі старых ліп. Незадоўга да Кастрычніка маёнтак перайшоў у рукі нейкага Цітава. Дом Некрасавых быў разбуран, а на яго месцы пабудаван новы. У ім змяшчаюцца цяпер грамадскія арганізацыі калгаса.

Няма ў жывых і сучаснікаў паэта. Некалькі год назад глыбокім старыком памёр апошні з іх — Нікалай Арэставіч Сарокін, былы прыгонны бацькі Некрасава.

Амаль у кожнай калгаснай хаце вісіць партрэт Некрасава. А сярод старых ліп — сучаснікаў паэта, акружаных маладымі дрэўцамі, пасаджанымі калгаснікамі, пабудаван будынак новага клуба, які носіць імя Некрасава. І праўнукі тых, каго паэт абараняў у сваіх вершах, святкуюць яго юбілей. Драматычны гурток падрыхтаваў новую пастаноўку. Калгасныя артысты пакажуць яе на ўрачыстым вечары.

КАРАБІХА

У 14-ці кілометрах ад Яраслаўля, на Маскоўскім шасе — Некрасаўскі запаведнік, былы маёнтак Некрасавых—Карабіха. Тут вялікі рускі паэт напісаў лепшыя свае творы.

У адным з флігеляў у Карабіхе жывуць зараз пляменніцы паэта Елізавета Фёдараўна Беляева-Некрасава і Анастасія Фёдараўна Некрасава — дочкі Фёдара, роднага брата паэта.

Расчышчаны ад снегу парадны ганак. Пярэдняя. Потым вялікі пакой, застаўлены старадаўняй мэбляй. Гасцей сустракаюць тры старушкі. Выявілася, што яшчэ раніцай у госці да жыхароў доміка прыехала іх сястра — трэцяя пляменніца паэта Вера Фёдараўна Андрэева.

У пакоі — партрэты паэта, яго брата Фёдара і Льва Талстога. У цяжкай раме на сцяне — партрэт паміраючага Некрасава.

Елізавета Фёдараўна, якой 69 год, добра памятае паэта. Яе сёстры маладзей і Некрасава не бачылі. Елізавета Фёдараўна дзеліцца сваімі ўспамінамі.

— Апошні раз я бачыла дзядзю сямігадовай дзяўчынкай. Многае сцёрлася ў памяці. Напярэдадні яго прыезду, а гэта было вясной, мы сядзелі за абедам. Нечакана бацька паведаміў радасную навіну: «Заўтра прыедзе дзядзя». Раніцай, ледзь пачало світаць, дзеці былі ўжо на нагах. Усе мы яго вельмі любілі.

Пачуліся гукі званочкаў. Мы выбегні за вароты. Да нас пад'ехаў экіпаж.

Адпачыўшы пасля дарогі, дзядзя адправіўся гуляць па парку. Мы з-за дрэваў сачылі за ім. Потым дзядзя запрасіў нас у свой флігель, і пачаліся ўсякія цікавыя расказы.

На наступны дзень Нікалай Алексеевіч ездзіў на паляванне. Як зараз бачу яго зварот. Стомлены ўвайшоў ён у дом. За ім на падносе неслі многа набітай дзічы.

...Успамінаецца другі прыезд паэта ў Карабіху. Зімой. Ён астанавіўся ў нас у доме. Яны з бацькам уязджалі на дзень у Яраслаўль. Вечарам у кабінеце бацькі сабралася ўся сям'я. У каміне гарэлі дровы. Свечы ў двух шандалах на пісьмовым стале ледзь асвятлялі прасторны кабінет. У той час газавых лямп яшчэ не было. Седзячы ў крэсле перад камінам, дзядзя па памяці чытаў свае вершы.

Флігель, дзе жывуць пляменніцы паэта, пабудаван пасля смерці Некрасава. Зараз домік перадан у пажыццёвае ўладанне пляменніцам паэта. Па распараджэнню Яраслаўскага аблвыканкома домік занава адрамантаван.

Елізавета і Анастасія Фёдараўны — персанальныя пенсіянеркі.

БОСАВА

Вёскі Босава, Агаркі, Мішолава, Багародскае і іншыя знаходзяцца ў 40—50 кілометрах ад Яраслаўля. Яны аб'яднаны ў калгас імя Будзённага, Большэсольскага раёна. Калгас уладае велізарнымі бульбянымі палямі.

«Так обращен нагой пустырь
В картофельное поле...
Вблизи — «Бабайский» монастырь
Село «Большие Соли»...

пісаў у вершы «Горе старого Наума» Н. А. Некрасаў. Не выпадкова паэт упамянуў аб манастыры. Амаль усе землі ў акрузе Вялікіх Солей належалі раней царкве. Здаючы зямлю ў арэнду сялянам, «бацькі святыя» люта эксплаатавалі беднякоў.

Зараз у калгаса імя Будзённага валяе тысячы гектараў зямлі, атрыманай ім у вечнае карыстанне; на бягучым рахунку ў банку ляжаць 32 тысячы рублёў. І толькі старыкі ўспамінаюць час, калі Якім Нагой

«...за соху взялся.
С тех пор лет тридцать жарится
На полосе под солнышком,
Под бороной спасается
От частого дождя.
Живет — с сохою возится...».

На пытанне, заданае цяпер 9-гадоваму школьніку — сыну босаўскага калгасніка Мокіна, — «што такое саха», хлопчык адказаў — «не ведаю». Затое школьніку добра знаёмы трактар, чатырохлемешны плуг і аўтамабіль. Калгасныя палі апрацоўвае Большэсольская МТС.

Заможна жывуць вёскі некрасаўскіх месц. У Босаве — 64 дамы і ні аднаго пад саломай. Многа дамоў, крытых жалезам.

У 1937 годзе калгаснікі знялі вялікі ўраджай. На 17 тысяч рублёў звыш плана здалі дзяржаве бульбы. Зароблену на працадні бульбу многія калгаснікі прадалі у розных гарадах. Дамоў прывезлі самавары, патэфоны, новыя плацці жонкам і дзецям, а сабе — касцюмы.

У былым доме босаўскага багацея — клуб. Драматычны гурток ставіць п'есы. З Вялікіх Солей часта наязджае механік з кінаперасоўкай.

Памяць Некрасава ў Босаве шануюць свята. Усе калгаснікі, ад старога да школьніка-першакласніка, ведаюць пра паэта. Жыхары Босава паказваюць прыезджым месца, дзе стаяла хата Якіма Нагога. 59 год назад, разам з вёскай, гэта хата згарэла.

Босава рыхтуецца да юбілею.

А. МАРОЗАЎ.

Яраслаўская вобласць.

ПЕРАПАДРЫХТОЎКА ГАЗЕТНЫХ РАБОТНІКАЎ

Рэспубліканскія курсы па перападрыхтоўцы газетных работнікаў пры ЦК КП(б)Б нядаўна выпусцілі 28 рэдактараў шматтыражак і наспенных газет, якія праходзілі вучобу на працягу двух месяцаў.

У канцы снежня на курсах пачалася вучоба другога набору слухачоў. Навучаюцца 45 літаратурных работнікаў і загадчыкаў аддзелаў гарадскіх, раённых і акруговых газет. Большасць слухачоў — гэта лепшыя рабкоры, селькоры, актывісты, вылучаныя нядаўна на работу ў рэдакцыі газет. У праграме курсаў — гісторыя ВКП(б), беларуская мова, геаграфія. Канстытуцыя СССР і БССР і практыка газетнай справы. Апрача гэтага будуць прачытаны лекцыі аб міжнародным становішчы, аб узбраеннях капіталістычных краін і т. д.

На працягу першага паўгоддзя вучобай на рэспубліканскіх курсах будзе ахоплена яшчэ 130 чалавек літаратурных работнікаў, загалчыкаў аддзелаў рэдакцый газет, намеснікаў рэдактараў і рэдактараў раённых газет.

ЖАНОЧЫ ЛЫЖНЫ ПРАБЕГ МЕНСК—МАСКВА

У азнаменаванне 20-й гадавіны Чы[рвонай] Арміі Цэнтральны совет Асоавіяхім БССР арганізоўвае звёздна-лыжную эс[фету] па раёнах рэспублікі. Будуць пр[ад]зены тактычныя вучэнні дапрызыўні[ко]ў, паходы комсамольскай моладзі ў прад[ме]ц газах.

У дзень гадавіны Чырвонай Арміі будуцца сустрэчы асоавіяхімаўцаў, пр[ад]раў і школьнікаў рэспублікі з Героямі [Са]вецкага Саюза, удзельнікамі грамадзян[скай] вайны і ордэнаносцамі. Напярэдадні ў [Ма]цебску, Магілеве, Гомелі і Бабруйску [ар]ганізуюцца лыжныя прабегі на бук[ва] матацыклаў. Фініш прабегу — у Мен[ску]. У дзень свята ў Менску будзе дан [ста]жаночаму лыжнаму прабегу на бук[ва] матацыклаў па маршруту Менск—Мас[ква].

12 лютага аўта-мотаклуб праводзіць [...] кілометравы аўтамабільны крос. 18 л[ю]га адбудуцца матацыклетныя спабор[ніц]твы на лепшую прахадзімасць матацы[клаў] у зімовых умовах.

ЗЛЁТ ВАРАШЫЛАЎСКІХ СТРАЛК[ОЎ]

У памяшканні клуба станкабудаўні[каў] завода імя Варашылава адбыўся злёт [ва]рашылаўскіх стралкоў і абароннага а[ктыву] ва прадпрыемстваў і ўстаноў Мен[ска], прысвечаны 20-й гадавіне Чырвонай [Ар]міі. Прысутнічала 500 чалавек.

Токар завода імя Варашылава тав. К[...]шчановіч расказаў у сваім выступлен[ні] пра асоавіяхімаўскія арганізацыі завода і [...]туюцца да юбілея.

— Мы абавязаліся падрыхтаваць з [...] лепшых варашылаўскіх стралкоў 10 [...]мадскіх інструктароў стралковага с[пор]та, 15 значкістаў варашылаўскіх стра[лкоў] 2-й ступені і 100 варашылаўскіх стра[лкоў] 1-й ступені, 150 значкістаў ППХА. Да [...]лея завод атрымае добра абсталяваны [...] метравы стралковы цір. 500 рабочых [...] да прымуць удзел у 20-кілометравым [...]ходзе ў працівагазах.

Актыўна рыхтуецца да гада[ві]ны Чырвонай Арміі абаронны актыў за[вода] імя Кірава. Аб гэтым паведаміў тав. [...]кін, актывіст абароннай работы за[вода]. Праводзяцца — перападрыхтоўка ўсіх [Вара]шылаўскіх стралкоў, унутрызаво[дскіх] стралковыя спаборніцтвы на выяўл[ен]не лепшага стралка і каманды, і т. д.

Злёт выклікаў на сацыялістычнае борніцтва на лепшую сустрэчу 20-й [го]віны Чырвонай Арміі асоавіяхімаўскі [ак]тыў Гомеля, Віцебска, Магілева і Бас[ка].

ПРЭМІРАВАННЕ СТАХАНАЎЦАЎ-КРЫВАНОСАЎЦАЎ

За ўзорную работу ў часе сталі[нскіх] дэкады стахановскіх рэкордаў Упраў[ленне] Заходняй чыгункі абвясціла падзя[ку] і прэміравала больш 50 чалавек, у ты[м лі]ку і рад лепшых стахановаў-крыва[но]саўцаў менскага аддзялення чыгункі.

Грашовыя прэміі атрымалі: лепш[ы] шыніст-крыванасавец менскага парав[оза] дэпо, комсамолец т. Мухаморaў А[лек]сандр; саставіцель паездоў т. Даніл[ю]; правадніх т. Крук; стрэлачнік тт. [...]ма і Процька, і інш.

Н. С.

АДПАЧЫНАК ПРАЦОЎНЫХ

У прайшоўшым годзе дзесяткі т[ысяч] рабочых, служачых, інжынерна-тэхні[чных] работнікаў БССР адпачывалі ў рэс[пуб]канскіх профсаюзных дамах адпачы[нку і] санаторыях. За 1937 год у 10 дама[х] пачынку адпачывала 40.900 чалавек, [...] у Ждановічах — 9 тысяч чалавек, [...]ках — 7 тысяч чалавек, і т. д. За [...] менскі аднадзённы дом адпачынку [...] пусціў 22.300 чалавек. У санаторы [«Ма]сноўка» лячыліся і адпачывалі 4.238 [ча]векі. На арганізацыю адпачынку пр[ацо]ўных БССР у мінулым годзе выдатк[аваны] звыш 9 млн. рублёў.

КОРАТКА

* **Агульнаадукацыйная школа для** [...] находнікаў і рацыяналізатараў п[...] пры гомельскім гортэхкабінеце. Слу[хачы] праходзяць механіку, фізіку, матэма[тыку], рускую мову, чарчэнне. У школе [...]чаецца 25 лепшых вынаходнікаў. А[...]таго пры гортэхкабінеце працуюць [...] школы па вывучэнню англійскай і н[ямецкай] моваў.

* **Куставы злёт стаханаўцаў,** дыр[экта]роў і інжынерна-тэхнічных работ[нікаў] прадпрыемстваў Наркаммясцпрома [...]каецца 8 студзеня ў Менску. У работ[ніка]та прымуць удзел 250 прадстаў[ніко]ў прадпрыемстваў Менска, Магілева, [Ві]сава і торфаводаў Белторфа. Злёт а[...]кує вынікі выканання плана 1937 г. [...] задачы на 1938 год.

Намеснік адказнага рэдак[тара]
І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Беларускі Дзяржаўны Драматычны тэатр
6 студзеня Абан. № 37
САЛАВЕЙ

Кінотэатр «Чырвоная зорка»
ДАЧКА РАДЗІМЫ

Кінотэатр «Пролетарый»
ЛЕНІН У КАСТРЫЧНІКУ

Дзіцячы гукавы кінотэатр
КАРО

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
КВІТНЕЮЧАЯ УКРАІНА

Гукавы кінотэатр «Спартак»
АРСЕН

ПАТРЭБНЫ работнікі СТАРАЖАВОЙ АХОВЫ І ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦЫ
Звяртацца: гор. Менск, пл. Волі, 4, «Главтабак».

ПАТРАБУЮЦЦА старшыя БУХГАЛТАРЫ
для складання гадавых справаздач у соўгасах. Звяртацца: Дом Урада, першы паверх, 118 пакой, да галоўбуха, тел. 22-714.

Расшукваю сына Рамана Антонавіча ДОЎНАРА, 24 г. Ведаючых аб яго месцазнаходжанні прашу паведаміць па адрасу: БССР, 8. Ратамка, Заслаўскага раёна, ДОЎНАР Марыі Іосіфаўне.

ВЫШЛА З ДРУКУ І ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ
(на рускай і беларускай мовах)
БРАШУРА
СТАЛІН І. В. Прамова на перадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы 11 снежня 1937 г.
У Вялікім тэатры. Пар твыдат. Ц. 10 кап.
ПАТРАБУЙЦЕ ва ўсіх кніжных магазінах і кіёсках КОГІЗ'а.
Пры адсутнасці брашуры на месцах ЗАКАЗЫ НАКІРОЎВАЙЦЕ па адрасу: г. Менск, Совецкая 50, «Кніга-поштай».
НА ПАШТОВЫЯ ЗАКАЗЫ да 10 экз. кошт кніг пасылайце паштовымі маркамі.

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» Ад 7 студзеня
на экране ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
ЖЫЦЬ
вытворчасці Ленфільм.

ВЫ ЗАЎСЁДЫ СВОЕЧАСОВА АТРЫМАЕЦЕ ВЫЙГРЫШЫ ПА АБЛІГАЦЫЯХ ДЗЯРЖПАЗЫК, КАЛІ БУДЗЕЦЕ КАРЫСТАЦЦА ПАСЛУГАМІ БЮРО ПА ПРАВЕРЦЫ ВЫЙГРЫШАЎ.
У любой ашчадкасе можна купіць КАРТКУ, коштам 5 капеек, на кожны нумар аблігацыі.
ЗАПОЎНІЦЕ КАРТКУ І ПАШЛІЦЕ ПОШТАЙ ПА АДРАСУ: г. Менск, Дом Урада, Упраўленне ашчадкас і дзяржкрэдыта БССР, БЮРО па ПРАВЕРЦЫ ВЫЙГРЫШАЎ
НА ПРАЦЯГУ УСЯГО ТЭРМІНУ ПАЗЫКІ БЮРО АКУРАТНА БУДЗЕ ПАВЕДАМЛЯЦЬ ВАМ АБ ВАШЫМ ВЫЙГРЫШУ.
Упраўленне ашчадкас і дзяржкрэдыта БССР.

Гукавы кінотэатр „Чырвоная Зорка"
АНОНС:

8 студзеня ў Менску СКЛІКАЕЦЦА
РЭСПУБЛІКАНСКІ АКТЫЎ
НАРКАМАТА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ БССР
па пытанню АБМЕРКАВАННЯ ЧАРГОВЫХ ЗАДАЧ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ Ў БССР.
Уваход на актыў па разасланых запрашальных білетах.
Паседжанне актыва роўна ў 7 гадзін вечара ў Доме партыйнага актыва (рог Энгельса і Карла Маркса).
НАРКАМАТ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

МЕНГАРАНА
ПАВЕДАМЛЯЕ НАСТАЎНІКАЎ г. Менска,
што 8 студзеня ў 11 гадзін раніцы, у памяшканні Дома працасветы
адбудзецца
АГУЛЬНАГАРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ НАСТАЎНІКАЎ
МЕНГАРАНА.

ШЫНАРАМОНТНАЯ МАЙСТЭРНЯ (Менск, Гандлёвая, 29)
ПАВЕДАМЛЯЕ ЎСІМ АЎТАГАСПАДАРКАМ І ВАЙСКОВЫМ ЧАСЦЯМ БССР,
ШТО МАЙСТЭРНЯ ПРЫСТУПІЛА да заключэння ДАГАВАРОЎ на 1938 г.
НА РАМОНТ АЎТАПАКРЫШАК і КАМЕР
Дагаворы будуць заключаны з аўтагаспадаркамі, якія маюць менш 5 машын.
Для заключэння дагавора прадстаўнік павінен мець пры сабе даведку, звесткі аб патрабуемым рамонце пакрышак і камер па разрах.
Апошні тэрмін заключэння дагавораў — 15 студзеня 1938 г.
Адначасова майстэрня паведамляе, што ЗДАНЬНЯ Ў РАМОНТ ПАКРЫШАК І КАМЕРЫ Ў 1937 г. ПАВІННЫ БЫЦЬ ВЫКУПЛЕНЫ ДА 15 студзеня 1938 г.
У выпадку нявыкупу да пазначанага тэрміну, гума будзе рэалізавана.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 63. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352; сакратарыята — 25-188, 29-830; аддзелаў: партыйнага — 21-353, совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412, прамысловага — 21-356, сельскагаспадарчага — 21-8[...] культуры — 23-955, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189, аддзела пісем — 20-844, 21-399, 21-885, ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21-550, аб'яў — 21-845.

Уп. Галоўлітбела № К—5405 Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. К., Л., Б.